№15-16 (276-277)
2010

# Права на волю

Праваабарончы бюлетэнь

## Пытаньні застаюцца...

**Адмена ці ўвядзеньне мараторыю на сьмяротнае пакараньне ў Беларусі зьяўляецца не адзіным пытаньнем, ад рашэньня якога залежыць аднаўленьне для беларускага парламенту статусу сьпецыяльна запрошанага ў Парламенцкую Асамблею Рады Эўропы, заявіла дакладчык па Беларусі камісіі па палітычных пытаньнях ПАРЭ Сініка Хурскайнэн у Менску.**

**"Гэтае пытаньне зьяўляецца не адзіным, але галоўным. Ёсьць яшчэ пытаньні па свабодзе СМІ, сітуацыі з правамі чалавека і, вядома, дэмакратыі", – адзначыла С. Хурскайнэн, адказваючы на пытаньне агенцтва "Інтэрфакс-Захад" у рамках сваёй сустрэчы з прадстаўнікамі няўрадавых арганізацыяў Беларусі.**

**Гаворачы пра праблематыку сьмяротнага пакараньня, дакладчык па Беларусі сказала, што ў Парламенцкай Асамблеі "натуральна" будуць улічваць меркаваньне беларускага грамадзтва па гэтым пытаньні.**

**С. Хурскайнэн заявіла, што знаходзіцца ў Беларусі з мэтай падрыхтоўкі справаздачы аб сітуацыі ў краіне. "Асноўнымі напрамкамі работы Рады Еўропы зьяўляюцца правы чалавека, дэмакратыя, вяршэнства закону. Па гэтых пытаньнях я і працую ў Беларусі", – адзначыла прадстаўнік ПАРЭ. Акрамя таго, праінфармавала яна, падчас візіту вывучаная сітуацыя, зьвязаная з выкананьнем рэкамендацыяў Асамблеі, якія былі выкладзены ў адрас Беларусі раней. Папярэдне ацэньваючы іх выкананьне, С. Хурскайнэн заявіла, што "добра працуе Інфармацыйны пункт Рады Еўропы. Мы бачым дыскусію на ўзроўні грамадзтва і парламенту па пытаньні сьмяротнага пакараньня. Усё гэта зьяўляецца пазітыўнымі зьменамі".**

*Праваабарончыя матэрыялы можна таксама прачытаць на сайтах: www.spring96.org; www.charter97.org; www.baj.ru*




Менск, 16 жніўня 2010 году.

## Ланцуг неабыякавых людзей

16 жніўня ў Менску адбылася акцыя салідарнасьці. Больш за 100 чалавек выйшлі з партрэтамі зьніклых палітыкаў Віктара Ганчара, Юрыя Захаранкі, Анатоля Красоўскага і журналіста Дзьмітрыя Завадзкага да будынку Акадэміі Навук.

На акцыю выйшлі розныя грамадзкія дзеячы, палітыкі, моладзевыя лідэры, у тым ліку намесьнік старшыні МФ Мікалай Дземідзенка, актывіст "Еўрапейскай Беларусі" Яўген Афнагель, паэт Уладзімір Някляеў, лідэр АГП Анатоль Лябедзька і іншыя. Але акцыя, як заўсёды, не прайшла без затрыманьняў.

Падчас акцыі было шмат міліцыянтаў, у тым ліку ў цывільным. Супрацоўнікі праваахоўных органаў папярэджвалі ўдзельнікаў акцыі, што акцыя не дазволена ўладай, што можа быць ужыта фізічная сіла. Таксама заклікалі разыходзіцца. Але людзі не зьвярталі ўвагі і заставаліся.

Падчас акцыі былі затрыманы Яўген Афнагель, Павел Юхневіч Максім Сергійц Андрэй Маўчан ды іншыя. Агулам 8 чалавек. Яны былі дастаўлены ў Першамайскі РУУС Менску. Праз пэўны час былі складзены пратаколы і затрыманыя былі адпушчаны на свабоду.



# Гэта і ёсьць канкрэтная праца

## Гомельскія праваабаронцы дапамагаюць грамадзянам абараняць свае правы

У Гомельскае аддзяленьне праваабарончага цэнтру "Вясна" па юрыдычную дапамогу зьвярнулася маладая жанчына Г. з просьбай дапамагчы вярнуць ад былога мужа іх непаўнагадовую дачку. Праваабаронцы Анатоль Паплаўны і Леанід Судаленка дапамаглі маці падрыхтаваць пазоў у суд, дзе ўзьнялі пытаньне аб перадачы ёй на выхаваньне дзесяцігадовай дачкі.

Як распавяла пацярпелая, у 2007 годзе з ёю адбыўся няшчасны выпадак – падчас аўтамабільнага ДТЗ яна атрымала адкрытую чэрапна-мазгавую траўму галавы, удар галаўнога мозгу цяжкай ступені. Яна страціла здольнасьць самастойна рухацца, аказалася бездапаможнай у побыце, не магла нават размаўляць. МРЭК прызнаў яе інвалідам 1-й групы.

– Муж-бізнэсоўца Р. такога выпрабаваньня ня вытрымаў – падаў у суд на развод. А паколькі нашу сямігадовую дачку даглядаць не было каму, дачка ўвесь гэты час выхоўвалася бацькам, які пасьпеў стварыць іншую сям'ю, нарадзіць ў новай сям'і дзіця. Наша дзяўчынка была вымушаная пражываць з мачыхай, – дзеліцца сваім горам Г.

Пасьля курсу рэабілітацыі стан здароўя жанчыны палепшыўся, ёй устаноўлена 3-я група інваліднасьці. Орган апекі і папячыцельства выдаў заключэньне, што па стане здароўя яна ў цяперашні час можа выконваць бацькоўскія абавязкі.

Леанід Судаленка тлумачыць, што "Кодэкс аб шлюбе і сям'і вызначае, што месца жыхарства дзіцяці пасьля скасаваньня шлюбу вызначаецца па ўзаемнай згодзе бацькоў. Пры адсутнасьці згоды спрэчка вырашаецца судом, зыходзячы з інтарэсаў дзіцяці. Суд улічвае, хто з бацькоў праяўляе большы клопат і ўвагу да дзіцяці, яго ўзрост і прыхільнасьці да кожнага з бацькоў, іх асабістыя якасьці, магчымасьць стварэньня належных матэрыяльна-бытавых умоваў і маральна-псіхалагічнай атмасферы, забесьпячэньня належнага ўзроўню выхаваньня. Улік меркаваньня дзіцяці, калі яно дасягнула дзесяцігадовага ўзросту, абавязковы, за выключэньнем выпадкаў, калі гэта супярэчыць яго інтарэсам".

Складанасьць сітуацыі палягала ў тым, што Г. не ў стане была выхоўваць сваю дачку каля трох гадоў, таму была няўпэўненая, што пад уплывам бацькі дзяўчынка пажадае застацца з ёй.

– Дамовіцца з былым мужам мірным шляхам аб перадачы мне нашай дачкі на выхаваньне ў нас не атрымліваецца. Выкарыстоўваючы сітуацыю, былы муж настройвае дачку супраць мяне і не таму, што моцна яе любіць і ня хоча з ёю расставацца, а з жаданьня "насаліць" мне, як былой жонцы, да таго ж прэтэндуючай у будучыні на падзел сумесна нажытай падчас шлюбу маёмасьці, – напісала ў суд Г.

Праваабаронца Анатоль Паплаўны перакананы ў тым, што "любому дзіцяці, тым больш дзяўчынцы, у першую чаргу патрабуецца ўвага, клопат і выхаваньне роднай маці, а не няхай нават самай лепшай на сьвеце мачыхі. Дзяўчынка, якая перанесла ў такім юным узросьце няшчасны выпадак з маці, распад сям'і, атрымлівае і будзе атрымліваць у будучыні псіхалагічныя траўмы ў выпадку яе пакіданьня на выхаваньне бацьку".

Праваабаронцы таксама маюць намер аказаць дапамогу ў пошуках адваката і арганізаваць незалежнае назіраньне за ходам справы ў судзе.

У Гомельскае аддзяленьне праваабарончага цэнтру "Вясна" па юрыдычную дапамогу зьвярнуўся пенсіянер М. з просьбай аказаць юрыдычную дапамогу пры падрыхтоўцы пазову ў суд аб спагнаньні з яго дарослай дачкі штомесячных плацяжоў на яго ўтрыманьне. Праваабаронцы Анатоль Паплаўны і Леанід Судаленка дапамаглі пенсіянеру-інваліду падрыхтаваць пазоў у суд Чыгуначнага раёну Гомелю, дзе паставілі пытаньне аб спагнаньні ў яго карысьць штомесячнага ўтрыманьня.

Як распавёў адзінокі мужчына, ён мае патрэбу ў тэрміновым пратэзаваньні ног, аднак пенсіі на аперацыю па пратэзаваньню відавочна не хапае. Прынятыя з яго боку спробы папрасіць грошай на аперацыю ў роднай дачкі, якая жыве ў Краснадарскім краі Расіі, былі беспасьпяховыя, дарослая дачка адмаўляецца аказваць дапамогу бацьку.

– Зьяўляючыся інвалідам 2-й групы, я ўвесь час вымушаны набываць дарагія лекі для лячэньня захворваньняў апорна-рухальнага апарату і ўнутраных органаў. Маё захворваньне пацьвярджаецца кансультатыўным заключэньнем ДУ "НДІ медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі", у сілу свайго ўзросту, стану здароўя я зьяўляюся матэрыяльна маючым патрэбу чалавекам, – дзеліцца сваім горам М.

– Кодэкс аб шлюбе і сям'і ўсталёўвае, што дзеці абавязаны клапаціцца пра бацькоў і аказваць ім дапамогу. Утрыманьне непрацаздольных, якія маюць патрэбу ў дапамозе бацькоў зьяўляецца абавязкам іх паўналетніх працаздольных дзяцей. Памер аліментаў, якія спаганяюць з дзяцей, вызначаецца судом у цьвёрдай грашовай суме, якая падлягае выплаце штомесяц, зыходзячы з матэрыяльнага і сямейнага становішча бацькоў і дзяцей, – аргументаваў іскавыя прэтэнзіі пенсіянера Леанід Судаленка.

– Упэўнены, суд задаволіць патрабаваньне пенсіянера, паколькі судовая практыка зыходзіць з таго, каб дзеці не забывалі сваіх бацькоў, якія маюць матэрыяльную патрэбу. Не зьяўляецца перашкодай для задавальненьня іску і той факт, што дарослая дачка пенсіянера пражывае ў Расіі, бо паміж краінамі СНД падпісана Канвенцыя аб прававой дапамозе і прававых адносінах па грамадзянскіх, сямейных і крымінальных справах, – заяўляе праваабаронца Анатоль Паплаўны.

Праваабаронцы таксама маюць намер аказаць пенсіянеру-інваліду дапамогу ў пошуках адваката, а таксама арганізаваць грамадскае назіраньне за ходам справы ў судзе.

# "Берасьцейскую вясну" зноў не зарэгістравалі

Праваабарончаму аб'яднаньню "Берасьцейская вясна" ў чарговы раз было адмоўлена ў рэгістрацыі. Падставай дзеля адмовы абласное ўпраўленьне юстыцыі назвала нібыта недакладны адрас жыхарства аднаго з заснавальнікаў, а менавіта нумар дому.

Старшыня аб'яднаньня, праваабаронца Уладзімір Вялічкін, так пракаментаваў сітуацыю:

– Па-першае, тыя дадзеныя, якія прадставіла Упраўленьне ўнутраных справаў Берасьцейскага аблвыканкаму Галоўнаму ўпраўленьню юстыцыі, не адпавядаюць рэчаіснасьці, то бок заснавальнік, супраць якога ўзьнікла прэтэнзія, усё-ткі жыве ў доме № 12, а дому за нумарам 13 увогуле няма...

Па-другое, гэтыя зьвесткі – не выпадковая памылка, а сьведчаньне таго, што ўлады вычарпалі ўсе законныя падставы, каб адмовіць нам у рэгістрацыі, і гэтым разам пайшлі на фальсіфікацыю дакумента, бо іншых магчымасьцяў абгрунтаваць сваю адмову проста няма. За шмат гадоў спробаў зарэгістраваць аб'яднаньне, мы выправілі ўсе магчымыя і немагчымыя недакладнасьці і апошні раз нават ня сталі сшываць статут, як таго патрабуе ўпраўленьне юстыцыі.

Аднак мы з аптымізмам глядзім у будучае і паспрабуем вырашыць пытаньне палюбоўна: мы працягнем руку прыязнасьці кіраўніцтву нашай вобласьці і пакажам, што зьвесткі, прадстаўленыя УУС, не адпавядаюць тым зьвесткам, якія знаходзяцца ў пашпарце грамадзяніна. У выпадку, калі ўлады ня пойдуць насустрач, мы зьвернемся ў суд, але пры гэтым мы згубім час, пакуль пройдзем усе інстанцыі. Таму спачатку паспрабуем усё ж такі дамовіцца.

# Тэрміну даўнасьці няма...

## Міжнародны дзень ахвяраў гвалтоўных зьнікненьняў

30 жніўня адзначаўся Міжнародны дзень ахвяраў гвалтоўных зьнікненьняў. Міжнародная канвенцыя аб абароне ўсіх асобаў ад гвалтоўных зьнікненьняў была прынятая 20 сьнежня 2006 году Генеральнай асамблеяй ААН. Дакумент падпісалі 57 дзяржаваў. 19 краінаў ужо ратыфікавалі Канвенцыю. Беларусь яе дагэтуль не ратыфікавала.

Тым часам праблема гвалтоўных зьнікненьняў для Беларусі актуальная. Восеньню 1999 году ў краіне бясьсьледна зьніклі адразу два вядомыя апазіцыянеры – былы міністр унутраных справаў Юры Захаранка і віцэ-сьпікер Вярхоўнага Савету XIII скліканьня Віктар Ганчар, а таксама буйны прадпрымальнік Анатоль Красоўскі. Летам 2000 году бясьсьледна зьнік аператар расійскага тэлеканалу ОРТ, былы асабісты аператар прэзідэнта Лукашэнкі Дзьмітрый Завадзкі.

Родным і блізкім дагэтуль нічога невядома пра іх лёс.

Паводле меркаваньня праваабаронцы Г. Паганяйлы, які ўжо доўгі час займаецца справамі гучных зьнікненьняў, "на аператыўным узроўні справы па зьніклых даўно раскрытыя". "Аднак сьледзтва блакуецца вышэйшым кіраўніцтвам краіны, якое не дае давесьці расьсьледаваньні да канца", – заявіў ён у інтэрв'ю БелаПАН.

"Я размаўляў са сьледчымі, якія заяўлялі: у выпадку зьмены ўлады дастаткова будзе двух тыдняў, каб завяршыць сьледзтва і перадаць справу ў суд. Трэба толькі адхіліць замяшаных у зьнікненьнях ад улады, скончыць сьледзтва і перадаць справу ў суд", – дадаў Г. Паганяйла.

"Мы разглядаем гэтыя справы ня так, як тлумачыць іх сьледзтва – па артыкуле "выкраданьне чалавека", тэрмін даўнасьці па якім складае 15 гадоў, – дадаў юрыст. – Мы лічым, што зьнікненьні ў Беларусі падпадаюць пад артыкул 128 Крымінальнага кодэксу – злачынствы супраць бясьпекі чалавецтва, па якой тэрмін даўнасьці адсутнічае.

І я веру ў тое, што найбліжэйшым часам гэтыя зьнікненьні будуць раскрытыя і суды над абвінавачанымі адбудуцца".



Амстэрдам, 30 жніўня 2010 году.

Нагадаем, што 4 жніўня 2010 году лідэры апазіцыі, грамадзянскай супольнасьці, праваабаронцы і іншыя вядомыя беларусы зьвярнуліся ў Савет бясьпекі ААН з просьбай правесьці міжнароднае расьсьледаваньне выкраданьняў людзей у Беларусі. Зварот быў накіраваны міністрам замежных справаў пастаянных сяброў Саўбесу ААН – Кітая, Расіі, Вялікабрытаніі, Францыі і ЗША.

Акцыя памяці Захаранкі, Ганчара, Красоўскага і Завадзкага прайшла 30 жніўня на цэнтральнай плошчы Амстэрдаму (Нідэрланды). Яе правялі актывісты беларускай грамадзянскай ініцыятывы "Мы памятаем".

# "Гэта не павінна паўтарыцца"

16 жніўня супрацоўнікамі міліцыі падчас распаўсюду ўлётак аб Міжнароднай канвенцыі аб абароне ўсіх асобаў ад гвалтоўных зьнікненьняў. Улёткі ўтрымлівалі інфармацыю і аб зьніклых у Беларусі палітыках. У той жа дзень у дачыненьні да Р. Кісьляка быў складзены пратакол аб адміністрацыйным правапарушэньні. Супрацоўнікі міліцыі палічылі, што праваабаронца ўчыніў правапарушэньне па частцы 2 артыкулу 22.9 КаАП РБ – незаконнае распаўсюджваньне друкаванай прадукцыі.

24 жніўня ў судзе Ленінскага раёну Берасьця разглядалася адміністрацыйная справа ў дачыненьні да праваабаронцы Рамана Кісьляка. Праваабаронцу абвінавачваюць у незаконным распаўсюдзе друкаванай прадукцыі. Паводле словаў Рамана Кісьляка, судзьдзя ўгледзеў у пратаколе недапрацоўкі, таму разгляд справы быў перанесены. Варта чакаць некалькі варыянтаў разьвіцьця падзеяў, кажа праваабаронца: "Цяпер недапрацоўкі ў пратаколе мусяць быць альбо выпраўленыя міліцыянтамі, тады буду чакаць новага судовага паседжаньня, альбо на гэтым будзе пастаўлена кропка, і справу проста спыняць. Пакуль складана сказаць, як будуць разгортвацца падзеі".


Раман КІСЬЛЯК.

30 жніўня Берасьцейскага праваабаронцу арыштавалі людзі ў цывільным за ўлёткі са словамі "Гэта не павінна паўтарыцца". Актывіста руху "За Свабоду" Рамана Кісьляка затрымалі на вуліцы Гогаля праз нейкі час пасьля таго, як ён скончыў раздачу каля кінатэатру "Беларусь" улётак "Гэта не павінна паўтарыцца". На выробленых ім улётках фармату А-5 былі напісаныя толькі гэтыя словы з жалобнай стужкай. Пасьля ўручэньня ўлётак мінакам праваабаронца распавядаў ім пра зьніклых вядомых людзей у Беларусі: Ю. Захаранку, В.Ганчара, А.Красоўскага і Дз. Завадзкага, – а таксама неабходнасьць запатрабаваць падпісаньня рэспублікай Міжнароднай канвенцыі для абароны ўсіх асобаў ад гвалтоўных зьнікненьняў.

За паўгадзінную акцыю на пешаходнай вуліцы Савецкай Кісьляк раздаў усе 50 асобнікаў улётак. На вуліцы Гогаля яго дагналі два чалавекі ў цывільным. Праваабаронцу даставілі ў Ленінскі РАУС Берасьця.

"Я прабыў там гадзіну. У міліцыі ў мяне ўзялі тлумачэньні пра тое, што, дзе і з якой мэтай я распаўсюджваў, а потым адпусьцілі", – паведаміў праваабаронца.

Нагадаем: заяўлены на 30 жніўня мітынг быў забаронены гарадзкімі ўладамі. Тым ня менш, актывіст Руху "За Свабоду" Раман Кісьляк у Міжнародны дзень ахвяраў гвалтоўных зьнікненьняў прыняў рашэньне правесьці інфармаваньне насельніцтва па згаданай праблеме.

# Алесь БЯЛЯЦКІ:
# "У беларусаў існуе калектыўны інстынкт страху"

***Кіраўнік зачыненага ўладамі праваабарончага цэнтру "Вясна", віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека (FIDH) Алесь Бяляцкі прызнаецца, што ў 1996 годзе не разьлічваў, што "давядзецца так доўга займацца праваабарончай дзейнасьцю". І выглядае так, што ў нашай краіне працы праваабаронцам хопіць надоўга. Гутарка з Алесем БЯЛЯЦКІМ была надрукаваная ў незалежнай газеце "СН плюс".***


Алесь БЯЛЯЦКІ.

***– Мне было цікава даведацца, што вы нарадзіліся ў Расіі, у Карэліі. Напэўна, за гэтым стаіць пэўная сямейная гісторыя...***

– Напэўна, за лёсам маёй сям'і можна прасачыць лёс цэлага пакаленьня беларусаў, якія вымушаныя былі ад'язджаць з Беларусі па тых ці іншых прычынах. Сям'я майго бацькі ў 1940 годзе выехала з Рагачоўскага раёну на забраныя Савецкім Саюзам у Фінляндыі карэльскія землі, выехалі, уцякаючы ад калгасаў і калектывізацыі. Тады ў Беларусі не было чаго есьці і дзеці проста пухлі ад голаду. Як распавядаў мой бацька, яны апынуліся ў Карэліі ў такім перадкалгасным раі, іх расьсялілі па хутарах карэлаў, якія так хутка ўцякалі ад СССР, што пакінулі ўсё, што было ў хаце.

Але, нягледзячы на тое, што бацька больш за 20 гадоў жыў у Карэліі, ён і ягоныя сёстры і браты заўсёды марылі вярнуцца ў Беларусь. У 60-я ў Беларусі пачалі будаваць вялікія прамысловыя аб'екты, набіралі працоўных, частка беларусаў вярталася на радзіму. Калі перад маёй сям'ёй у 1964 годзе паўстаў выбар – Сьветлагорск ці Салігорск, – то бацькі выбралі Сьветлагорск, бо ён быў бліжэй да радзімы і бацькі і маці. Калі мы вярнуліся ў Беларусь, мне было паўтары гады.

***– У 1986-м вы сталі адным з заснавальнікаў і старшынёй таварыства маладых літаратараў "Тутэйшыя". Што вас прывяло да "нефармалаў", у беларускую нацыянальную антыкамуністычную дзейнасьць яшчэ да перабудовы?***

– Я дастаткова рана пачаў ставіцца крытычна да савецкай рэчаіснасьці. Гэта ішло паступова, пачынаючы ад пытаньняў, зьвязаных з мовай і культурай. Яшчэ ў школе я захапіўся беларускай літаратурай, потым паступіў на гомельскі філфак і сутыкнуўся з рэзкім абмежаваньнем ужываньня мовы, з палітыкай дэбеларусізацыі, якая праводзілася тады (дый праводзіцца і цяпер).

Быў унутраны пратэст, спачатку індывідуальны. Калі ў 1981 годзе я пачаў першым на факультэце паўсюль размаўляць па-беларуску, спачатку з мяне сьмяяліся, хутка перасталі. Пасьля знайшліся аднадумцы, і мы спрабавалі супрацьстаяць русіфікацыі на сваім узроўні. Упершыню ў Гомелі на пачатку 80-х зьявілася група студэнтаў, якія сьвядома размаўлялі на беларускай мове. У 1984 годзе, калі я заканчваў універсітэт, у нас ужо некалькі дзясяткаў чалавек размаўлялі па-беларуску.

Натуральна, што моцны ўплыў на нас аказвалі менскія адраджэнцы. Калі я пазнаёміўся з Вінцуком Вячоркам, Ірынай Вячоркай, Сяржуком Сокалавым-Воюшам, Сяргеем Запрудзкім, Алесем Сушам, тады для мяне стала зразумела, што мы не апошнія з магіканаў, што ў руху ёсьць добрыя персьпектывы. Фактычна, гэта ўжо была падпольная беларуская нацыянальна-дэмакратычная праца, якая грунтавалася на жаданьні бачыць Беларусь незалежнай, дэмакратычнай, з наборам грамадзянскіх і палітычных свабодаў.

Калі я ўвосень 1986 году прыйшоў з войска, то ідэя стварэньня аб'яднаньня літаратараў ужо лунала ў паветры. За некалькі месяцаў да нас далучылася каля 60 чалавек, практычна ўся найбольш актыўная пішучая моладзь. Мы напісалі маніфест, у якім абвясьцілі, што будзем займацца літаратурай, і будзем рабіць гэта прынцыпова, не паддаючыся на тыя "прыкарытныя" выгады, якія выдзялялі беларускім пісьменьнікам савецкія ўлады ўзамен за лаяльнасьць. Вядома, маніфест гэты меў эфект бомбы, што разарвалася. "Тутэйшыя" бралі актыўны ўдзел у агульных акцыях, якія тады ладзіліся "нефармальнымі" беларускімі суполкамі: гэта і першыя мітынгі ў Беларусі ў 1987 годзе, гэта і Дзяды 1988 году. Мы былі адны з ініцыятараў аб'яднаньня беларускай моладзі, якое адбылося ў 1987 годзе на Першым вальным Сойме Канфедэрацыі беларускіх суполак, а затым аднымі з ініцыятараў стварэньня БНФ – першага шырокага легальнага дэмакратычнага руху ў савецкай Беларусі, які вельмі шмат зрабіў для незалежнасьці Беларусі.

***– Вы разумелі, што за вашай дзейнасьцю пільна сочаць адпаведныя органы? Як вы да гэтага ставіліся тады, у пачатку 80-х, у час самага глыбокага застою? Ці гаварылі вы на сваіх паседжаньнях усё, што думаеце, ці, вобразна кажучы, прыкладалі палец да вуснаў?***

– Наш асяродак быў падзелены на два колы – больш вузкае, нелегальнае, і больш шырокае, адкрытае для ўсіх. Першае, гэта група "Адраджэньне", у якую ўваходзіла ня больш за 15 асобаў у розныя часы. Сяргей Дубавец, Алесь Суша, Сяржук Сокалаў-Воюш, Вінцук Вячорка, Віктар і Яўген Івашкевічы, Генадзь Сагановіч, Генадзь Лойка, Алесь Костка. Там, вядома, мы былі вельмі шчырыя і адкрытыя.

Распрацоўка планаў нашых дзеяньняў (а гэта разьвіцьцё моладзевага дэмакратычнага руху, выпуск нелегальнай друкаванай прадукцыі, мы выдавалі часопіс "Бурачок", пракламацыі, улёткі) адбывалася з прыёмамі сур'ёзнай канспірацыі. Але патрапіць у гэтую групу было зусім ня проста, адбор туды з больш шырокага кола ішоў вельмі ўважліва і не сьпяшаючыся. Напрыклад, пасьля майго знаёмства з менскімі хлопцамі мне прапанавалі ўступіць у гэтую групу толькі праз паўтары гады.

Першая палова 80-х была дастаткова суворая. У 1983 годзе адбыўся амаль поўны разгром дысідэнцкіх груповак у Расіі , Украіне, у Прыбалтыцы і на Закаўказьзі. Тысячы людзей пайшлі ў турмы. Ясна, што КДБ круцілася вакол нашых асяродкаў. Вядома ж, было страшна. Было зразумела, што, ступіўшы на гэтую сьцежку, мы пазьней ці раней сутыкнёмся з машынай падаўленьня іншадумства. Але мы сур'ёзна прадумвалі тыя крокі, якія маглі рабіць – яны былі на мяжы дазволенага, але фармальна да іх немагчыма было прычапіцца. Калі мы праводзілі Купальле, ці Гуканьне вясны, сьвяткавалі Каляды, сьпявалі фальклор, езьдзілі на рэстаўрацыю помнікаў, то фармальна да такіх дзеяньняў цяжка было прычапіцца.

Зразумела, што была інфільтрацыя ў тое больш шырокае, "легаль-

нае" кола людзьмі, якія працавалі на КДБ. Дастаткова сказаць, што сярод заснавальнікаў "Тутэйшых" ужо на першым паседжаньні быў адзін паэт, які на пачатку 90-х прызнаўся, што ён супрацоўнічаў з КДБ.

Фактычна органы "перацiралi" кожную творчую асобу, усе мае знаёмыя, з кім я маю шчырыя кантакты, гаварылі, што да кожнага з іх падыходзілі супрацоўнікі КДБ і спрабавалі вербаваць. Падыходзілі да мяне таксама, калі я ўжо быў старшынёй "Тутэйшых". Але нашы спатканьні скончыліся пасьля першага разу, бо я адмовіўся працягваць нейкія кантакты, хаця мне абяцалі адно-другое-трэцяе. У нас была выпрацавана цьвёрдая пазіцыя, што ні ў якія гульні з гэтай канторай гуляць не пажадана.

***– З 1992 па 1996 год вы былі дэпутатам Менскага гарсавету, таксама ў 90-я вы былі намесьнікам старшыні БНФ. Калі ў вас зьявілася жаданьне ці неабходнасьць ісьці ў праваабарончую дзейнасьць? Дапамог вопыт паўпадпольнага існаваньня?***

– У пачатку 90-х мы займаліся праваабарончымі пытаньнямі праз уладныя механізмы. Я сам уваходзіў у камісію гарсавету па рэпрэсаваных у 30–50-я гады, якая займалася рэабілітацыяй рэпрэсаваных. І думалася, што асноўныя грамадзкія і палітычныя правы будуць вырашацца ў парламенцкім, заканадаўчым полі. Але пасьля абраньня Лукашэнкі сітуацыя зьмянілася. Калі вясной 1996 году быў з ужываньнем гвалту разгромлены "Чарнобыльскі шлях", адбыліся сутычкі з міліцыяй, то тады ўзьнікла група па хуткім аказаньні дапамогі – затрыманым і іх сем'ям.

Але, на жаль, гэтым усё ня скончылася – зьявіліся першыя палітзьняволеныя. Нагадаю, ад 1988 году, калі былі разагнаныя Дзяды, у Беларусі да 1996 году не разганяліся вулічныя дэманстрацыі. Таму ў грамадстве быў пэўны шок, мы адвыклі ад таго, што такое можа адбывацца. Таму ня дзіва, што ўзьнікла наша праваабарончая арганізацыя "Вясна-96". Але шчыра скажу, тады мы не думалі, што давядзецца працаваць гэтак доўга.

***– Ці адрозьніваюцца беларусы чым-небудзь у галіне правоў чалавека ад іншых нацыяў? Як у гэтай сферы выяўляецца наш менталітэт? Часта кажуць, што для большасьці беларусаў важныя толькі сацыяльныя пытаньні, а правы чалавека і свабоды – гэта дастаткова абстрактныя рэчы для вельмі многіх…***

– Відаць, сапраўды большасьць беларусаў даволі пасіўна і асьцярожна ставяцца да абароны сваіх грамадзкіх і палітычных правоў. Гэта ў крыві з сталінскіх часоў – боязь і недавер да грамадзкай дзейнасьці, бо існуе разуменьне, што ты заўсёды можаш пацярпець за гэта.

***– А як вы ставіцеся да наступнай вечнай дылемы: адны кажуць, што спачатку трэба падняць эканоміку, народзіцца сярэдні клас, і ён ужо пачне думаць пра правы і свабоды. Іншыя ж кажуць, што тут няма такой марксісцкай залежнасьці ад эканомікі, маўляў, расьце і багацее Кітай, але правоў там больш не становіцца, а ў багатых арабскіх краінах няма і размовы пра дэмакратыю?***

– Натуральна, я шмат разоў думаў пра гэта. Усё ж такі сапраўды, калі грамадства больш заможнае, яно больш мабільнае, гэта дае больш магчымасьцяў для спазнаньня сьвету, сацыяльнага і грамадзкага прагрэсу. Хаця я згодны, што гэта не паўсюль так, і часам тут перашкаджаюць нацыянальныя традыцыі.

Але ў нас, у Беларусі, традыцыі змаганьня за свабоду і дэмакратыю маюць вельмі моцныя гістарычныя карані. Залаты век, апошняя траціна XVIII стагодзьдзя, калі ў нас буялі розныя філасофскія школы, калі мысьляры развівалі паняцьце правоў чалавека, якое ўпершыню загучала тады на нашых землях, мелі доступ да ўлады і займаліся пераўтварэньнямі ў эканоміцы і адукацыі. Яны ў тыя часы ўжо рыхтавалі адмену прыгону, і сам Ж.-Ж. Русо зьбіраўся пераехаць жыць у Беларусь. Гэта быў вельмі цікавы час, які скончыўся з падзеламі Рэчы Паспалітай і акупацыяй Беларусі дэспатычнай Расейскай імперыяй.

***– Пасьля зьмены рэжыму наўрад ці ў беларускіх праваабаронцаў адразу зьнікне праца?***

– Грамадства не зьмяняецца так хутка. Зьмена любой улады не прыводзіць да структурных зьменаў у галовах, яны не праходзяць за адзін год. Мы яшчэ доўга мусім працаваць над асьветаю нашага грамадзтва, каб людзі разумелі, што такое правы чалавека…

***– Ну вось жыве звычайны беларус, які ходзіць на працу на завод ці ў офіс. Ён усім у прынцыпе задаволены і ні ў чым ня бачыць парушэньня сваіх свабодаў. Як яму даказаць, што ён жыве ў неправавой дзяржаве і што ён павінен выступіць у абарону сваіх правоў?***

– Сапраўды, дастаткова часта можна пачуць: "ды кіньцеся вы, займаецеся абы чым. Абы вайны не было". Альбо – "пры Сталіне было лепш, бо быў парадак". Гэта кажуць людзі, выхаваныя ў таталітарнай сістэме, якія не разумеюць, што такое правы чалавека. Наўрад ці ёсьць магчымасьць ім нешта патлумачыць, яны ўжо сфармаваныя, і такімі застануцца.

Але людзі вельмі часта мяняюцца, калі сустракаюцца з несправядлівасьцю, што датычыць менавіта іх. Вось тады зьмены адбываюцца вельмі хутка. І калі раптам яны трапляюць за краты ці сустракаюцца з бязьлітаснай усемагутнасьцю дзяржавы, тады яны пачынаюць гаварыць пра правы чалавека, зьвяртаюцца ў праваабарончыя арганізацыі.

Але калі чалавека гэта не датычыць, то ён часта і не жадае расплюшчыць вочы, паглядзець, што робіцца навокал. Бо ёсьць калектыўны інстынкт страху, закладзены яшчэ ў сталінскія часы – не ўлазіць, не вытыркацца, не фігураваць. І адна з нашых задачаў у працы з грамадзтвам – пераламаць гэты страх, каб чалавек адчуваў сябе больш годным і вартым павагі.

# Вольга Карач – лаўрэатка міжнароднай прэміі за мужнасьць



Вольга КАРАЧ.

**Віцебская праваабаронца Вольга Карач стала лаўрэаткай міжнароднай Радэбойльскай прэміі "За мужнасьць".**

**Прэмія названая ў гонар нямецкага мястэчка Радэбойль (прыгарад Дрэздэна), дзе ў 1645 годзе было падпісана перамір'е, і такім чынам пакладзены канец трыццацігадовай вайне (1618–1648) – аднаму з першых еўрапейскіх канфліктаў.**

**Ад 2004, раз на два гады, Радэбойльская прэмія мужнасьці прысуджаецца грамадзкаму дзеячу з Цэнтральнай, Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы за заслугі ў справе абароны грамадзкіх інтарэсаў, аховы прыроды і правоў чалавека.**

**Паводле арганізатараў конкурсу, сёлетняя лаўрэатка вядомая ў сябе на радзіме як аўтарка праекту, накіраванага на захаваньне прававой законнасьці, а таксама на разьвіцьцё грамадзянскай супольнасьці ў складаных умовах.**

**У мінулыя гады лаўрэатамі прэміі таксама былі прадстаўнікі Беларусі: журналіст Аляксей Кароль і праваабаронца Алег Волчак. Сёлетняя цырымонія ўручэньня прэміі, памер якой складае 5000 еўра, па традыцыі адбылася ў знакамітай старадаўняй радэбойльскай Царкве Міру.**

# Вымушаны ад'езд

## Сяргей Панамароў папрасіў прытулку ў Польшчы

***Актывіст апазіцыі з Клецку Сяргей Панамароў папрасіў палітычнага прытулку ў Польшчы. У Беларусі супраць яго была заведзеная крымінальная справа паводле арт. 369 КК РБ ("Зьнявага прадстаўніка ўлады"). Да суда Панамароў мусіў знаходзіцца пад падпіскай аб нявыезьдзе.***


Фота "НН"

Сяргей ПАНАМАРОЎ і Алег АЛКАЕЎ.

Знаёмы клецкі міліцыянт папярэдзіў жонку Панамарова Сьвятлану, што яе мужу трэба тэрмінова зьяжджаць за мяжу. Нібыта ў Клецкі РУУС прыяжджаў супрацоўнік КДБ, пры сабе меў папку з прозьвішчам апазіцыянера і казаў, што з ім трэба скончаць. За Панамаровым усталявалі сачэньне. У Менск ён паехаў з пустымі рукамі, рэчы для яго падрыхтавалі сябры ў сталіцы. Спачатку паехаў у Маскву, а адтуль праз Кіеў у Варшаву. У сталіцы Польшчы яго сустрэлі прадстаўнікі фонду "Свабода і дэмакратыя" ("Wolność i demokracja"). Сяргей Панамароў папрасіў палітычнага прытулку. Цяпер ён знаходзіцца ў лагеры ўцекачоў пад Варшавай. Разам з ім там перабывае полацкі маладафронтавец Зьміцер Сакалоў. Асноўны кантынгент лагеру – каўказцы, акрамя двух беларусаў прытулку чакае адзін украінец.

Вымушаны ад'езд даўся клецкаму актывісту няпроста: "Вельмі цяжка, бо мне ўжо хутка 59 гадоў", – кажа С. Панамароў.

Панамароў перакананы, што пад арыштам з ім магло здарыцца ўсё, што заўгодна. Пры гэтым ён не хавае, што яму сорамна за свой ад'езд. У Польшчы ён плануе знайсьці працу, паралельна мяркуе працягваць грамадзка-палітычную дзейнасьць. "Я ўжо сустракаўся з Алесем Зарэмбюком, да мяне з Берліна прыязджаў Алег Алкаеў", – кажа Панамароў. У Беларусь ён зьбіраецца вярнуцца толькі пасьля зьмены рэжыму.

Жонка Панамарова Сьвятлана Анатолеўна расказала, што ў Клецку пакуль усё ціха. "Здаецца, Сяргея пакуль не хапіліся. Нам даслалі дзьве павесткі ў суды – на 23 жніўня па крымінальнай справе, на 26 па адміністрацыйнай". Спадарыня Сьвятлана не выключае, што яе мужа маглі справакаваць на ўцёкі. Але пры гэтым яна адзначае, што сама ўгаворвала яго зьехаць, бо атрымала перасьцярогі ад вартай даверу крыніцы.

"Ягоная крымінальная справа шытая белымі ніткамі, але ў нашай краіне зусім няма надзеі на справядлівы суд, а ў Сяргея ня той узрост і здароўе, каб ні за што ісьці ў турму", – распавяла Сьвятлана Анатольеўна.

23 жніўня ў судзе Слуцкага раёну адбылося судовае паседжаньне па справе клецкага актывіста апазіцыі Сяргея Панамарова. Яго вінавацілі паводле арт. 369 КК РБ ("Зьнявага прадстаўніка ўлады"). Справу на Панамарова завялі сёлета 25 траўня. Супраць Панамарова судзяцца пяць клецкіх чыноўнікаў: старшыня Клецкага райвыканкаму А. Бойка, судзьдзя райсуда А. Гасьцеева, старшыня раённага савету дэпутатаў П. Дудук і клецкія міліцыянты А. Кананові і С. Здрок. Паводле сьледзтва, абразы вышэйпамянёным асобам Панамароў нанёс сваімі артыкуламі ў выдаваным ім бюлетэні "Бойкі Клецк".

Як паведаміў адвакат С. Панамарова Павел Сапелка, у судзе клецкага актывіста абвясьцілі ў вышук. Ранейшая мера стрыманьня – знаходжаньне пад расьпіскай аб нявыезьдзе – зьмененая на ўтрыманьне пад вартай у турме №8 г. Жодзіна. Паводле словаў адваката П. Сапелкі, калі суд пацьвердзіць факт знаходжаньня Панамарова па-за межамі Беларусі, ён можа быць асуджаны завочна.

**Паводле "НН".**

***Даведка:*** *Сяргей Панамароў нар. у 1951 у Расіі. У Беларусі з 1989. У 2004, калі ягоная жонка балатавалася ў парламент, паміж Панамаровым і старшынёй клецкага райвыканкаму А. Бойкам разгарэўся канфлікт. Вынікам стала зьнішчэньне бізнэсу сп. Панамарова – у яго фактычна адабралі сталярны цэх. З таго часу Панамароў пайшоў у апазіцыю да ўладаў: пачаў выдаваць бюлетэнь "Бойкі Клецк", стварыў сайт, дзе рэзка крытыкаваў мясцовую вертыкаль і праваахоўныя органы. Яго колькі разоў спрабавалі прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці за паклёп у друкаваным выданьні. Акрамя таго, Сяргей Панамароў займаўся праваабарончай дзейнасьцю – да яго неаднаразова зьвярталіся па дапамогу мясцовыя жыхары, пакрыўджаныя дзеяньнямі ўладаў і міліцыі. На сваім сайце Панамароў асьвятляў і сацыяльныя пытаньні – напрыклад, умовы пражываньня ў адным з клецкіх інтэрнатаў, праблемы п'янства, асацыяльных паводзінаў у публічных месцах, у прыватнасьці ў гарадзкім парку. Ён прапаноўваў мясцовым уладам зачыніць у скверы бар, каб туды маглі спакойна прыходзіць бацькі з малымі дзецьмі.*

*У дні салідарнасьці, а таксама на непрызнаныя сёньняшняй уладай сьвяты Панамароў рэгулярна вывешваў над сваім домам вялікі бел-чырвона-белы сьцяг.*

# "Хуліганы" вяртаюцца на акцыі?

У судзе Савецкага раёну Менску 5 жніўня прайшлі судовыя паседжаньні над удзельнікамі акцыі, прысьвечанай 20-годзьдзю Дэкларацыі аб незалежнасьці Беларусі. Паводле словаў абвінавачаньня, 27 ліпеня чатыры чалавекі на плошчы Якуба Коласа хапалі міліцыянтаў за рукі ды форму, адштурхоўвалі, брыдка лаяліся ды пагражалі праблемамі на службе. Адным словам – паводзілі сябе неадэкватна.

Для ўсіх падсудных з боку абвінавачаньня сьведкамі выступілі капітан міліцыі Дзмітры Валынцаў, супрацоўнікі палка міліцыі сьпецыяльнага прызначэньня Багдан Жакун і Андрэй Целіхавец, якія 27 ліпеня пасьля ўскладаньня кветак на плошчы Якуба Коласа затрымалі некалькі ўдзельнікаў, якія нібыта парушалі грамадзкі парадак і спакой грамадзянаў.

Вячаслаў Сіўчык заявіў хадайніцтва аб беларускамоўным вядзеньні справы. Атрымаў адмову. Астатнія просьбы: у дапамозе адваката, далучэньні да справы фотаздымкаў з мерапрыемства, прыцягненьні новых сьведак – былі задаволеныя.

Мікола Дземідзенка на судовае паседжаньне не зьявіўся. Юнак перадаў заяву, дзе прасіў разглядаць справу ў яго адсутнасьць.

Як распавёў у судзе Дзьмітры Валынцаў, сабраныя на плошчы Якуба Коласа людзі выкрыквалі лозунгі, сярод якіх прысутнічала нецэнзурная лаянка. Паводле словаў капітана міліцыі, на плошчы Коласа былі менавіта лозунгі, якія – не памятае, сэнсу ня ведае. Але цьвёрда перакананы, што чуў іх. "Гэта быў мітынг – там была сімволіка ў выглядзе белачырвоных кветак", – пракаментаваў на судзе Багдан Жакун.

На пытаньне Кацярыны Давыдзік, што было ў яе руках, Андрэй Целіхавец адказаў: "Вашыя рукі былі на маіх плячах, пагонах і на нагах. Можа ў вас нож быў!" Аналагічныя паказаньні даў другі сьведка. Як кволая дзяўчына адначасова магла шкамутаць двух здаровых міліцыянтаў, сьведкі не патлумачылі.

Праваабаронца Наста Лойка паказала суду некалькі дзясяткаў здымкаў, якія зрабіла падчас затрыманьняў. На яе думку, яны сьведчаць пра незаконныя дзеяньні ў той дзень міліцыянтаў адносна Сіўчыка ды іншых актывістаў. Былі і іншыя супярэчнасьці ў паказаньнях сьведкаў, аднак судзьдзі не зьвярнулі на гэта ўвагі.

У выніку актывістаў пакаралі штрафамі. Міколу Дземідзенку і Кацярыне Давыдзік судзьдзя Іна Ляўкова прысудзіла штраф у 3 базавыя велічыні (105 тысячаў рублёў). Судзьдзя Аксана Рэлява пакарала Вячаслава Сіўчыка і Андрэя Кіма грашовымі штрафамі ў памеры 10 базавых велічыняў (350 тысячаў рублёў).

Варта адзначыць, што некаторы час пры затрыманьні актывістаў падчас акцыяў і мітынгаў супрацоўнікі міліцыі пры складаньні пратаколаў не выкарыстоўвалі артыкул 17.1 КаАП (дробнае хуліганства). І вось ізноў вярнуліся да "брыдкаслоўя".

Нагадаем, увечары 27 ліпеня ў Менску група актывістаў апазіцыі адзначала 20-годзьдзе прыняцьця Дэкларацыі аб незалежнасьці Беларусі. Актывісты ўсклалі кветкі да помніка Якубу Коласу і пайшлі ўздоўж праспекту Незалежнасьці да помніка Янкі Купалы, калі іх пачалі затрымліваць амапаўцы. Былі затрыманыя і адвезеныя ў Савецкае РУУС Менску Вячаслаў Сіўчык, Мікола Дземідзенка, Андрэй Кім і Кацярына Давыдзік.

# "У палку сувязі – праблема з сувязьзю"

Цэлы месяц адслужыў у асобным Тыльзіцкім палку сувязі магілёўскі маладафронтавец Станіслаў Рамановіч. Яго прызвалі ў войска 30 ліпеня. Нядаўна ён даслаў на Радыё "Свабода" свой першы ліст. У лісьце Станіслаў Рамановіч піша, што з камандаваньнем часткі ён размаўляе па-беларуску. Праблемаў з гэтым пакуль не паўставала. Як сьцьвярджае актывіст, яго некалькі разоў выклікалі на гутарку да вайсковых ідэолагаў. Іх цікавіла ягоная дзейнасьць на "грамадзянцы": "Яны спрабавалі даведацца, як мая ранейшая дзейнасьць адаб'ецца на маёй вайсковай службе. Даводзілі, што на "гражданцы" было адно, а цяпер трэба служыць", – адзначае Станіслаў Рамановіч.

У частку маладафронтавец прыбыў апошнім, з дзесяцідзённым спазьненьнем. Цяпер, паводле яго словаў, яму даводзіцца наганяць раней прыбылых навабранцаў. Чатыры дні малафронтавец праляжаў у вайсковым шпіталі. На "грамадзянцы", незадоўга да прызыву, яму зрабілі аперацыю на руцэ. Як сьлед загаіцца яна не пасьпела. Лекары адводзілі на рэабілітацыю да трох месяцаў. Аднак іх вайсковыя калегі палічылі інакш і пастанавілі, што хлопец годны да службы. У войска ён пайшоў яшчэ з ня зьнятымі швамі. У частцы, як кажа Рамановіч, яго вызвалілі на тыдзень ад фізічнай і шыхтовай падрыхтоўкі. Потым лекары будуць вырашаць, што рабіць далей.



Станіслаў РАМАНОВІЧ.

На вайсковую службу Станіслаў Рамановіч не наракае. Харчаваньне і санітарныя ўмовы лічыць добрымі.

"У палку сувязі ёсьць, аднак, праблема з сувязьзю. Тут толькі адзін таксафон. І ён не заўжды працуе. За ўвесь час службы я толькі аднойчы патрапіў з яго патэлефанаваць і тое з цяжкасьцю", – адзначае С. Рамановіч.

Нагадаем: сёлета ўвесну маладафронтаўца адлічылі з Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэту імя Куляшова. Фармальная прычына – нездавальняючыя адзнакі, аднак сам юнак сьцьвярджае, што гэта адбылося з палітычных матываў. Пасьля адлічэньня Станіслаў Рамановіч зьбіраўся працягнуць навучаньне, пасьпяхова прайшоў тэставаньне, аднак яго нечакана прызвалі ў войска.

## Маляваў крэйдай – атрымай штраф...

**24 жніўня Салігорскі суд пакараў штрафамі двух маладафронтаўцаў. Андруся Тычыну і Рыгора Астапеню абвінавацілі ў непадпарадкаваньні міліцыі і прысудзілі штраф у 700 тысячаў рублёў.**

**Нагодай стала акцыя, прымеркаваная да дня падпісаньня Дэкларацыі аб незалежнасьці. 27 ліпеня маладафронтаўцы зьбіраліся зладзіць конкурс малюнкаў крэйдай на асфальце.**

**Сярод затрыманых у той дзень былі таксама Іван і Ільля Шылы. На цяперашні час яны зьехалі, а суды над актывістамі перанесьлі па іх уласнай просьбе. Пра гэта паведаміў актывіст Маладога Фронту Аляксей Валабуеў.**

**"Андрусю Тычыну і Рыгору Астапеню далі па 700 тысячаў штрафу. Аштрафавалі за непадпарадкаваньне міліцыі. Адзін хлопец быў не з Маладога Фронту. Ён проста маляваў крэйдай, і яго выпадкова затрымалі", – распавёў А. Валабуеў.**

**Нагадаем: Конкурс малюнкаў у Салігорску 27 ліпеня сарвала міліцыя. Як толькі ўдзельнікі пачалі маляваць крэйдай на асфальце, міліцыянты затрымалі шасьцярых юнакоў: Івана Шылу, Аляксея Валабуева, Рыгора Астапеню, Андруся Тычыну, Ільлю Нагорнага, Сяргея Герановіча. На кожнага з шасьці затрыманых склалі па два пратаколы: за ўдзел у несанкцыянаваным мерапрыемстве і за непадпарадкаваньне супрацоўнікам міліцыі. У Салігорску штогод ладзіцца конкурс малюнкаў, прымеркаваны да гадавіны абвяшчэньня Дэкларацыі аб незалежнасьці.**

## Мікола УЛАСЕВІЧ:

# "Справа цалкам сфабрыкаваная"

23 жніўня ў Астравецкім судзе разглядалася справа Мікалая Уласевіча. Старшыню Астравецкай раённай арганізацыі АГП абвінавачвалі ў непадпарадкаваньні пажарнікам, якія прыйшлі да яго, каб правесьці праверку ў хаце. Сам Мікалай Уласевіч лічыць гэтую справу цалкам сфабрыкаванай.

Яшчэ ў мінулым годзе Мікола Уласевіч зьвярнуўся ў мясцовыя органы ўлады з тым, каб па сваім хатнім адрасе зарэгістраваць раённую суполку Аб'яднанай грамадзянскай партыі, сябрам якой ён зьяўляецца. Пажарны інсьпектар, правёўшы абсьледаваньне, адмовіў у рэгістрацыі і напісаў больш за 10 прадпісаньняў, якія трэба было выправіць. Паводле словаў Уласевіча, гэта былі дробныя прадпісаньні кшталту: прыбраць старыя рэчы з гары, адсунуць газавую пліту на 20 см ад сьцяны і г. д. Большасьць з іх, якія Уласевіч палічыў рэальнымі, ён выправіў. Аднак з кожнай наступнай праверкай пажарныя інсьпектары, паводле яго словаў, патрабавалі выкананьня новых прадпісаньняў. Уласевіч, у сваю чаргу, пачаў пісаць скаргі іх кіраўніцтву ў вобласьць і нават міністру МНС.

Апошні раз пажарныя інсьпектары ішлі да Уласевіча з праверкай выкананьня прадпісаньняў 25 чэрвеня, у дзень народзінаў Уласевіча, і спаткалі яго недалёка ад крамы. Уласевіч сказаў, што ня пойдзе разам з імі дамоў, паколькі іх патрабаваньні носяць незаконны характар.

Пазьней гэта і стала прадметам разгляду ў судзе. У матэрыялах адміністрацыйнай справы, якую завялі супраць яго, Мікола Уласевіч знайшоў перапіску начальніка раённага КДБ С. Шмурэя з начальнікам Астравецкага РАНС Г. Колтунам. У адным з лістоў начальнік раённага КДБ просіць правесьці паўторную праверку прадпісаньняў пажарнага інсьпектара ў доме Уласевіча, а ў другім начальнік


Мікола УЛАСЕВІЧ.

Астравецкага РАНС рапартуе, што Уласевіч не ўпусьціў інсьпектара ў дом і аб гэтым правапарушэньні паведамлена ў пракуратуру.

Гэтую перапіску Мікалай Уласевіч і лічыць аператыўнай распрацоўкай сьпецслужбаў у адносінах да яго асобы з тым, каб перашкодзіць яму займацца палітычнай дзейнасьцю. Суд, паводле словаў Уласевіча, ягоныя аргументы пакінуў без увагі і цалкам заняў пазіцыю дзяржаўнай структуры.

На паседжаньні суда 23 жніўня высьветлілася, што Мікалай Уласевіч не даваў падставаў не праводзіць праверку. Аднак канчатковае рашэньне суда наўрад ці будзе справядлівым. Так лічыць старшыня Гарадзенскай абласной арганізацыі АГП Юры Істомін, які прысутнічаў на паседжаньні.

На судзе выступілі асноўныя сьведкі. У сваю чаргу Мікалай Уласевіч заявіў шэраг хадайніцтваў, з якіх было прынятае толькі адно.

"Высьветлілася (і гэта пацьвердзілі сьведкі), што Мікалай Уласевіч не даваў падставаў не праводзіць праверку, з якой прыехалі пажарныя інсьпектары, – распавядае Юры Істомін. – Ён сам падаў заяву, каб разьмясьціць у сваёй хаце раённую арганізацыю АГП і быў зацікаўлены, каб гэты працэс скончыўся як мага хутчэй. Адметна яшчэ і тое, што праверку вырашылі правесьці менавіта ў дзень народзінаў спадара Уласевіча".

Далейшыя падзеі, паводле сьведчаньняў, выглядалі так. Калі пажарныя пад'ехалі, Мікалай Уласевіч выйшаў з хаты і сказаў, што не давярае ім, бо яны наўмысна зацягваюць працэс, і што не жадае, каб праверку праводзілі без законных на тое падставаў. І пайшоў далей па вуліцы. Пры гэтым істотна, што ўладальнікам хаты зьяўляецца ня ён, а яго жонка. Аднак да жонкі пажарныя інсьпектары не зьвярнуліся.

"Верагодна, што гэтыя паказаньні сьведак пацьвердзяць правату Міколы Уласевіча", – лічыць Юры Істомін. – Але тое, што асноўныя хадайніцтвы Уласевіча былі адхіленыя, дае падставу меркаваць, што рашэньне суда ня будзе справядлівым. Да таго ж частка матэрыялаў была вынятая са справы. Сярод іх – адмысловы ліст за подпісам кіраўніка раённага аддзелу УКДБ, каб гэтую справу супрацоўнікі МНС давялі, як кажуць, да лагічнага завяршэньня. Усё гэта сьведчыць пра тое, што справу супраць Уласевіча замовіў раённы аддзел УКДБ. Таму пажарныя ня могуць сказаць, што ўсе іх патрабаваньні выкананыя, што ўсё нармальна ў спадара Уласевіча з хатай, і можна зарэгістраваць раённую арганізацыю АГП. Яны маральна залежаць ад рашэньня УКДБ".

24 жніўня ў Астравецкім судзе быў агучаны прысуд актывісту АГП Міколу Уласевічу. Суд пакараў яго буйным грашовым штрафам. Яго прызналі вінаватым у непадпарадкаваньні пажарным інсьпектарам. Мікола Уласевіч з рашэньнем суда ня згодны, лічыць яго палітычна матываваным і мае намер абскардзіць гэтае рашэньне ў вышэйшай інстанцыі.

# Неспакойныя выходныя

**ДОБРУШ.** 7 жніўня супрацоўнікі дэпартаменту аховы МУС затрымалі актывістаў "Руху "За Свабоду" Сяргея Сьцепанца і Яўгена Суворава. Як паведаміў БелаПАН старшыня гомельскага аддзяленьня руху "За Свабоду" Пятро Кузьняцоў, маладыя людзі распаўсюджвалі на мясцовым рынку канверты з тэзамі перадвыбарнай праграмы Аляксандра Мілінкевіча і анкеты. Раздача інфармацыйных матэрыялаў праходзіла ў рамках кампаніі "Народная праграма". Пратаколу не складалі, інфармацыйныя матэрыялы таксама не забіралі", – дадаў Кузьняцоў.

**ГАРОДНЯ.** На аўтавакзале ў Горадні 8 жніўня міліцыянты затрымалі Міколу Баўсюка – каардынатара аргкамітэту Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі. У яго на руках былі асобнікі газеты "Крыніца". Яго даставілі ў Кастрычніцкі РАУС, дзе былі канфіскаваныя сто асобнікаў газеты "Крыніца", каля сямідзесяці буклетаў выбарчай праграмы старшыні аргкамітэту БХД Віталя Рымашэўскага і некалькі дзясяткаў бланкаў для збору подпісаў аб перадачы каталікам былога кляштару ў Менску. Міліцыянты склалі пратакол канфіскацыі друкаванай прадукцыі, пакінулі яе для дзесяцідзённай праверкі. Спадара Баўсюка адпусьцілі.

**МАГІЛЁЎ.** У нядзелю, 8 жніўня магілёўская міліцыя затрымала праваабаронцу Валерыя Шчукіна. Яго адвезьлі ў Ленінскі РАУС Магілёва, дзе былі канфіскаваныя буклеты, прысьвечаныя правам жанчын.

"Паводзілі міліцыянты сябе карэктна, аднак я на іх усё адно напісаў скаргу. Нас пратрымалі чатыры гадзіны замест трох. Не далі мне копіі пратаколу правапарушэньня, а таксама не далі азнаёміцца з матэрыяламі справы. Я доўга дамагаўся, каб мяне азнаёмілі з пратаколам канфіскацыі. На ўсе мае патрабаваньні мне адказвалі, што не паложана", – распавёў В. Шчукін.

Як паведаміў Валеры Шчукін, міліцыянты склалі пратакол незаконнай перавозкі друкаванай прадукцыі. Буклеты застануцца ў міліцыі, зазначае праваабаронца, да суда, які мае вызначыць, што з імі рабіць далей. Разам з праваабаронцам быў затрыманы актывіст кампаніі "Наш дом" Віктар Калесьнік.

# Сьвяткаваў дзень народзінаў – аштрафавалі за мітынг

Суд Івацэвіцкага раёну 4 жніўня аштрафаваў на 700 тысячаў рублёў маладога жыхара гораду "за парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавага мерапрыемства або пікетаваньня". Такім мерапрыемствам, на думку міліцыянераў, стала адзначэньне дня народзінаў юнака.

Віталь, жыхар гораду Івацэвічы, ня першы год адзначае свой дзень народзінаў на прыродзе ў вялікай кампаніі. На бераг Шчары сёлета праз інтэрнэт, праз знаёмых запрашаліся ўсе ахвотныя адпачыць і адзначыць дзень народзінаў сябра. Міліцыянты палічылі, што на мерапрыемства сабралася каля 400 чалавек, а гэта размах масавага мерапрыемства, на правядзеньне якога неабходны дазвол. Паводле міліцыянераў, правапарушэньне заключаецца ў тым, што інфармацыя пра сьвяткаваньне была ў інтэрнэце. Гэта стала падставай для складаньня пратаколу паводле артыкулу 23.34 Адміністрацыйнага кодэксу "За парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавага мерапрыемства або пікетаваньня".

"Была інфармацыя ў Інтэрнэце пра арганізацыю мерапрыемства. Таму там сабралася шмат людзей. У наш РАУС паступіла адна заява, паводле якой справа перададзена ў падатковую інсьпекцыю. Паводле заявы, уваход на мерапрыемства быў платны – у памеры 20 тысячаў рублёў. Толькі дзякуючы таму, што на мерапрыемстве прысутнічаў нарад міліцыі, там не адбылося надзвычайных здарэньняў. Увогуле там усе былі п'яныя", – патлумачылі міліцыянты.

Сам імяніньнік, Віталь, кажа, што ня можа зразумець, чаму яго аштрафавалі. З матэрыяламі, якія сабралі міліцыянеры, ён не пагаджаецца. Што да заявы пра платны ўваход, то гэта недакладная інфармацыя: "Само мерапрыемства прайшло бяз нейкіх непрыемнасьцяў. Калі былі скрадзеныя тэлефоны, то павінны быць адпаведныя заявы, калі было шмат п'яных, дык тады павінны былі быць складзеныя пратаколы ДАІ. Я пазьней даведваўся ў бальніцы, што на медыцынскае асьведчаньне тады быў завезены толькі адзін чалавек. Але гэта быў нейкі трактарыст СПК, які да мяне ня меў ніякага дачыненьня", – распавёў сп. Віталь.

Адзін з удзельнікаў імпрэзы, Валер, кажа, што на самой справе гэтульки народу не было. Сабралася, штопраўды, даволі шмат людзей, але ўсё прайшло спакойна: "Было сапраўды і вельмі цікава, і арганізавана прыстойна. Людзі захацелі адпачыць і выехалі за 26 кіламетраў ад раённага гораду. Сапраўды, там было шмат людзей, але не 400, як сьцьвярджаюць міліцыянеры. Гэта не глядзелася як мітынг ці парад. Не магло ісьці гаворкі і пра нейкую цісканіну".

Валер кажа, што ў раёне складана з адпачынкам для моладзі. Афіцыйныя дыскатэкі на плошчы заўсёды праводзяцца паводле адной і той жа праграмы з году ў год. Арганізатарам дня народзінаў, у тым ліку і Віталю, з аддзелу культуры паступіла прапанова арганізаваць нешта падобнае на прыродзе афіцыйна ад мясцовага Дому культуры. Віталь кажа, што пасьля суда гэтая прапанова проста сьмеху вартая.

# Складу злачынства не было

Бабруйскі гарадскі суд 31 жніўня паўторна разгледзеў справу па абвінавачаньні кіраўніцы Магілёўскай абласной арганізацыі БХД Таісы Кабанчук у супраціве міліцыянтам пры затрыманьні 25 сакавіка.

Пасьля двух з паловай гадзінаў разгляду і выступленьня васьмі сьведак судзьдзя пастанавіла закрыць справу з-за адсутнасьці складу злачынства.

"Судзьдзя намагалася даведацца, на якой падставе міліцыянты Мінін і Шкрадзюк, якія мяне затрымлівалі, падрыхтавалі рапарт аб тым, што я аказвала супраціў. Аднак яны ня здолелі гэтага растлумачыць. Я мяркую, што судзьдзя вымушана была вынесьці справядлівы вырак, бо, па-першае, справа была яўна "шытая белымі ніткамі". А па-другое, напярэдадні выбараў улады, напэўна, ня хочуць даваць нагоду негатыўна ацэньваць іх дзеяньні", – паведаміла Таіса Кабанчук.

Нагадаем: Таісу Кабанчук затрымалі 25 сакавіка на бабруйскім чыгуначным вакзале, калі яна зьбіралася сесьці ў цягнік на Менск, каб удзельнічаць у сьвяткаваньні Дня Волі. Жанчына паведаміла, што міліцыянты пашкодзілі ёй руку і зламалі акуляры. Яны тлумачылі, што нібыта маюць інфармацыю, паводле якой Таіса перавозіць наркотыкі. У пастарунку міліцыі


Фота svaboda.org
Таіса КАБАНЧУК.

пасьля перагляду рэчаў на Таісу Кабанчук склалі пратакол за непадпарадкаваньне міліцыянтам. Яе хацелі судзіць у дзень затрыманьня, але жанчына запатрабавала адваката. Таіса заявіла, што яе затрымалі выключна з палітычных меркаваньняў.

Прызначаны на 31 сакавіка суд быў перанесены.

Пазьней Кабанчук паведамілі, што Бабруйскі суд разгледзеў справу пра супраціў міліцыянтам і прызнаў яе вінаватай, але вырашыў не караць. То бок справа была разгледжаная без прысутнасьці абвінавачанай. Таісія Кабанчук падала з гэтай нагоды скаргу ў пракуратуру. Цяпер Бабруйскі суд быў вымушаны разгледзець справу наноў, паведамляе прэсавая служба БХД.

## Затрыманьне правамернае?

**Намесьнік старшыні рэспубліканскага грамадзкага аб'яднаньня "Персьпектыва", сябра Свабоднага прафсаюзу Беларускага Віктар Чайкоўскі атрымаў адказ з Берасьцейкага ўпраўленьня ўнутраных справаў на сваю скаргу адносна гвалтоўнага затрыманьня на цэнтральным чыгуначным вакзале ў Берасьці.**

**З дасланага адказу вынікае, што дзеяньні супрацоўнікаў міліцыі па яго затрыманьні і вобшуку правамерныя, паколькі быў ананімны званок пра тое, што Віктар Чайкоўскі правозіць літаратуру, якая ўтрымлівае паклёп на прэзідэнта.**

**Паводле словаў Чайкоўскага, у пратаколе асабістага затрыманьня і вобшуку напісана пра літаратуру інакш: "У пратаколе напісана, што мы перавозім літаратуру антыдзяржаўнага зьместу, а ў адказе з упраўленьня "літаратуру, якая ўтрымлівае паклёпніцкі зьмест на прэзідэнта".**

**Не пагадзіўся з высновамі супрацоўнікаў абласнога УУС і юрыст-праваабаронца Раман Кісьляк: "Лічу затрыманьне і вобшук Віктара Чайкоўскага парушэньнем яго права на свабоду і асабістую недатыкальнасьць. Віктар Чайкоўскі перасьледуецца за сваю грамадзянскую актыўнасьць, свае погляды і іх распаўсюджваньне. Затрыманьне Чайкоўскага па ананімным званку парушае яго грамадзянскія правы. Віктар Чайкоўскі намераны ў далейшым абскарджваць дзеяньні супрацоўнікаў міліцыі.**

# Міхась Башура застаецца за кратамі

*6 жніўня* каля сваёй кватэры быў затрыманы актывіст кампаніі "Гавары праўду" Міхась Башура А 17-й гадзіне ў дзьверы здыманай Міхасём Башурам кватэры пагрукаў чалавек у цывільным. Ён па-панібрацку прапанаваў Башуру выйсьці паразмаўляць. Той адмовіўся і дзьвярэй не адчыніў. Аднак чалавек у цывільным не сышоў. Калі а 19-й гадзіне Башура мусіў выйсьці з кватэры па справах, яго перастрэлі і настойліва прапанавалі праехаць у Савецкі РУУС. На актывіста склалі пратакол, затрымалі на трое сутак і зьмясьцілі ў турму на Акрэсьціна. *9 жніўня* тэрмін заключэньня пад вартай быў працягнуты да дзесяці дзён.

*16 жніўня* Міхасю Башуру было прад'яўлена абвінавачаньне па частках 1 і 2 артыкулу 380 Крымінальнага кодэксу "Падробка, выраб, выкарыстаньне альбо збыт падробных дакументаў, штампаў, пячатак, бланкаў". Два гады таму, выступаючы даручнікам жонкі, якая брала крэдыт, Башура нібыта прадаставіў даведку аб заробку, у якой былі завышаныя даходы. За гэта актывісту кампаніі "Гавары праўду" пагражае 3 гады зьняволеньня, альбо грашовы штраф ці 5 гадоў абмежаваньня волі. Міхась Башура не прызнае сябе вінаватым і тлумачыць усё памылкай пры разьліках прыбыткаў.


Міхась БАШУРА.

Справу вядзе міліцыя Савецкага раёну Менску. Як паведаміла адвакат Башуры Тамара Сідарэнка, цяпер штодня актыўна вядуцца сьледчыя дзеяньні.

У кампаніі "Гавары праўду" зьвязваюць перасьлед Міхася Башуры з ягонай актыўнасьцю ў гэтай кампаніі.

*19 жніўня* суд Савецкага раёну Менску не задаволіў скаргу адваката Тамары Сідарэнкі на зьмяненьне меры стрыманьня падабароннаму Міхасю Башуру. Дадзенае судовае рашэньне абскарджана ў Менскім гарсудзе. Па хадайніцтве адвакаткі яе падаабаронны пераведзены ў Жодзінскае СІЗА.

*30 жніўня* адвакат Тамара Сідарэнка наведала ў жодзінскім сьледчым ізалятары актывіста кампаніі "Гавары праўду" Міхася Башуру. Гэта было першая сустрэча адваката з падабаронным з 18 жніўня, калі Міхася Башуру перавялі з менскага ізалятару ў жодзінскі.

"На ўмовы ён ня скардзіўся. Казаў, што добра кантактуе з суседзямі па камеры, няма праблемаў і з адміністрацыяй ізалятару. Напісаў на волю ліст, да жонкі, але з волі пакуль нічога не атрымлівае. Пра справу мы амаль не гаварылі", – паведаміла Тамара Сідарэнка.

*31 жніўня* Менскі гарадзкі суд адмовіўся вызваліць з-пад варты актывіста кампаніі "Гавары праўду" Міхаіла Башуру. З адпаведнай касацыйнай скаргай зьвярталася яго адвакат Тамара Сідарэнка. Менгарсуд палічыў, што Башура быў узяты пад варту законна, паколькі ў дачыненьні да яго ўзбуджаная крымінальная справа за падробку дакументаў.

Паводле словаў адваката, у Беларусі наўрад ці знойдуцца людзі, якіх заключалі б пад варту па тым артыкуле Крымінальнага кодэксу, які інкрымінуецца Башуру.

## Мікалай АЎТУХОВІЧ:

# "Відаць, сядзець мне тут 5 гадоў..."

4 жніўня стала вядома, што Ваўкавыскі прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч знаходзіцца ў выпраўленчай калоніі №5 у Івацэвічах. Пра гэта паведаміў праваабаронца Алег Воўчак. Інфармацыя пра тое, што Аўтуховіча накіравалі ў калонію "Ваўчыныя норы" не адпавядае сапраўднасьці – "Ваўчыныя норы" знаходзяцца пад Берасьцем, а ВЧ №5 узмоцненага рэжыму – у Івацэвічах.

Гэткую тэрміновую адпраўку па этапе Мікалай Аўтуховіч тлумачыць тым, што адміністрацыя СІЗА №1 Менску спалохалася яго заявы аб падтрымцы дэмакратычных кандыдатаў у прэзідэнты.

Як адзначыў Алег Воўчак, Мікалай Аўтуховіч цяпер як быццам "знаходзіцца на рэабілітацыі" – умовы ўтрыманьня ў СІЗА №1 і ВЧ-5 моцна адрозьніваюцца ў лепшы бок.

21 жніўня праваабаронца Алег Воўчак падзяліўся зьвесткамі з першага ліста, дасланага Мікалаем Аўтуховічам з калоніі. Аўтуховіча пасьля карантыну зьмясьцілі ў 13-ы атрад, пачуваецца вязень нядрэнна. Раней Аўтуховіч не выключаў, што пачне галадоўку пратэсту, калі ня будуць лячыць зубы, але днямі вязьню далі абяцаньне неўзабаве пачаць лячэньне і таму пра галадоўку пакуль гаворка не ідзе.

Алег Воўчак плануе перадаць сябру ў калонію блэндэр для апрацоўкі ежы, каб было лягчэй есьці. Той блэндэр, які быў у Аўтуховіча ў менскім ізалятары, яму не ўдалося захапіць з сабой ў калонію, бо на этап яго адправілі ноччу, ня даўшы сабраць рэчы. Дарэчы, Аўтуховіч паведаміў пра такую асаблівасьць этапаваньня з Менску ў Івацэвічы: болей за 5 сутак давялося прабыць у Баранавіцкім ізалятары, дзе ўмовы ня лепшыя з-за перанаселенасьці. Чаму вязьняў гэтак доўга трымаюць на этапе, праваабаронцу незразумела. І вось яшчэ што, паводле словаў Алега Воўчака, распавёў, Мікалай Аўтуховіч.

"Ён, відаць, разгублены, што пра яго справу быццам як і сталі забываць. Дамагліся, што зьнялі абвінавачаньне ў тэрарызьме, а з астатнім зьмірыліся".

Алег Воўчак працытаваў словы з ліста Аўтуховіча: "Відаць, давядзецца мне сядзець тут усе 5 гадоў...".

Праваабаронца заклікае людзей, якім не абыякавы лёс Мікалая Аўтуховіча, ліставацца з ім па адрасе: "Івацэвічы-3, выпраўленчая ўстанова №5, атрад №13, Аўтуховічу Мікалаю Мікалаевічу".

30 жніўня адвакат Павел Сапелка наведаў у калоніі свайго падабароннага Мікалая Аўтуховіча. "Падаў наглядную скаргу, а так ўсё ідзе сваёй хадой. Мікалай Аўтуховіч разьмешчаны ў атрад, уцягваецца ў турэмны быт, прызвычайваецца. Вельмі зьдзіўляецца, чаму разам з ім у калоніі не сядзяць тыя, хто фальшаваў ягоную справу падчас сьледзтва", – паведаміў Павел Сапелка.

Здароўе вязьня адвакат ацаніў як нармальнае, але дадаў, што да абяцанага лячэньня зубоў, на чым настойваў Аўтуховіч, справа дагэтуль не дайшла.

Тым часам праваабаронца Алег Воўчак паведаміў, што рэчы Аўтуховіча, якія засталіся на Валадарцы, ўдалося забраць і, што магчыма, іх перашлюць Аўтуховічу. Сябры ўжо адправілі М. Аўтуховічу у калонію тэлефонную картку і адзін раз ён пазваніў.

"Прасіў адваката рыхтаваць скаргу, чаму не прыцягваюць да адказнасьці тых сьледчых, якія падраблялі доказы ў ягонай крымінальнай справе", – распавёў праваабаронца.

# "Антыпалітычная накіраванасьць"

## Віншаваньне з Днём Незалежнасьці названае самаўпраўствам...

18 жніўня старшыня Гомельскай абласной арганізацыі АГП Васіль Палякоў быў выкліканы ў Цэнтральны райаддзел міліцыі, дзе ў дачыненьні да яго старшы інспектар аддзелу прафілактыкі правапарушэньняў Уладзіслаў Шукель склаў адміністрацыйны пратакол за самаўпраўства.

Маёр міліцыі заявіў, што да адказнасьці будуць прыцягнутыя і іншыя ўдзельнікі акцыі, затрыманыя ў абласным цэнтры падчас распаўсюду віншавальных улётак ад АДС 26 ліпеня ў дзень 20-годзьдзя абвяшчэньня беларускай незалежнасьці. Супрацоўнікі міліцыі ўгледзелі ў тэксьце інфармацыю "антыпалітычнай накіраванасьці".

"Я напісаў скаргу на наша незаконнае затрыманьне. Мяне выклікалі ў міліцыю. Я думаў для таго, каб разабрацца з маёй скаргай, але аказалася, што пакараць вырашылі не міліцыянтаў, а мяне. Абвінавачаньне "высмактана" з пальца, мне прад'яўляюць прэтэнзіі ў дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі, паколькі мы распаўсюджвалі ўлёткі ад імя каардынацыйнага Савету Аб'яднаных дэмакратычных сілаў. Прычым тут свавольства, мне не зразумела?" – абураецца Васіль Палякоў.

Запрашэньне па тэлефоне на размову да маёра В. Шукеля ўжо атрымаў і праваабаронца Анатоль Паплаўны, які заявіў, што без позвы ён езьдзіць толькі да цешчы. Праз гадзіну пасьля званка маёр асабіста прывёз дадому позву праваабаронцу.


Анатоль ПАПЛАЎНЫ.

"Я запатрабаваў позву, бо не ўпэўнены ў правамернасьці дзеяньняў міліцыі. Канфіскацыя віншавальных улётак прайшла з шматлікімі парушэньнямі адміністрацыйнага кодэксу. Не запрасілі панятых, у пратаколе не выклалі тэксту канфіскаваных улётак. Як вядома, за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі ў нашай краіне ўстаноўлена нават крымінальная адказнасьць. 18 жніўня супраць мяне таксама складзены адміністрацыйны пратакол за самаўпраўства. Маёр У. Шукель перад складаньнем пратаколу не растлумачыў мне правы і абавязкі, таксама адмовіўся весьці адміністрацыйны працэс на беларускай мове, заявіўшы, што я павінен разумець рускую мову", – падкрэсьліў Анатоль Паплаўны.

Варта адзначыць, што раней міліцыя па дадзеным артыкуле апанентаў улады не перасьледавала. Відавочна, напярэдадні надыходзячай прэзідэнцкай кампаніі ўлада вынаходзіць супраць сваіх апанентаў новыя метады адміністрацыйнай практыкі. Санкцыя прад'яўленага актывістам у віну артыкулу 23.39 КаАП прадугледжвае штраф ад двух да дзесяці базавых велічыняў.

# Міжнародны дзень моладзі па-беларуску

Актывісты кампаніі "Гавары праўду" адзначылі Міжнародны дзень моладзі, заснаваны ААН, і перадалі ў Міністэрства адукацыі свае крытычныя ацэнкі працы камітэту па моладзі пры гэтым міністэрстве.

Міхась Пашкевіч адразу паведаміў журналістам, што акцыя не палітычная і будзе складацца з двух частак. Напачатку актывісты паспрабавалі паказаць на плакатах каляндар звычайнага маладога беларуса. Аднак людзі ў цывільным і з рацыямі выхапілі з рук актывістаў плакаты і папрасілі разысьціся "пахарошаму". Таму актывісты "Гавары праўду" вымушаны былі перайсьці да другой часткі "сьвяткаваньня" Дня моладзі. У Міністэрства адукацыі была перададзена петыцыя, з заклікам ліквідаваць Упраўленьне па справах моладзі пра Міністэрстве адукацыі

"Мы перадаем спадару Радзькову дакумент, у якім раскрываецца марнасьць існаваньня ўпраўленьня па справах моладзі. Упраўленьне па сутнасьці нічога ня робіць у нашай краіне. Таму мы заклікаем Міністэрства адукацыі быць ашчаднымі і не выдаткоўваць дарма свае рэсурсы", – патлумачыў Міхась Пашкевіч журналістам.


Фота svaboda.org

Міхась ПАШКЕВІЧ перадае петыцыю памочніку міністра адукацыі.

Актывістам кампаніі "Гавары праўду" прапанавалі кінуць петыцыю у паштовую скрыню. Аднак маладыя людзі ўсё ж такі сустрэліся з памочнікам міністра адукацыі і перадалі дакумент яму ў рукі. Той у сваю чаргу паабяцаў, што петыцыя будзе разгледзена адпаведна працэдуры падобнага кшталту дакументаў. Пасьля перадачы звароту супрацоўнікі міліцыі, што загадзя дзяжурылі каля месца правядзеньня мерапрыемства, затрымалі Міхася Пашкевіча.

Апрача гэтага ў часе мерапрыемства супрацоўнікі міліцыі ўжылі сілу супраць журналістаў газеты "Наша Ніва" Юліі Дарашкевіч і Радыё Свабода Галіны Абакунчык, аднак да затрыманьня рэпарцёраў справа не дайшла.

13 жніўня Маскоўскі суд Менску аштрафаваў актывіста кампаніі "Гавары праўду!" Міхася Пашкевіча на 1 мільён 400 тысячаў рублёў. Пашкевіч прызнаны вінаватым у арганізацыі несанкцыянаванай акцыі да Міжнароднага дня моладзі, які адзначаецца 12 жніўня.

# Фрылансеры па-за законам

## Тацьцяну Бублікаву папярэдзілі за журналісцкую дзейнасьць

10 жніўня сябра ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" Тацьцяна Бублікава атрымала ад Гомельскай абласной пракуратуры папярэджаньне аб недапушчальнасьці парушэньня закону "Аб СМІ". Паводле дакумента, Т. Бублікава займаецца журналісцкай дзейнасьцю незаконна, бо ня мае працоўных і іншых стасункаў са сродкамі масавай інфармацыі. Пракуратура Гомельскай вобласьці зацікавілася журналісцкай дзейнасьцю Тацьцяны Бублікавай на падставе заявы грамадзяніна Віктара Лебяшкова. Спадар Лебяшкоў, які працуе аграномам у калгасе "Урыцкае", 30 чэрвеня даў Тацьцяне Бублікавай і "невядомаму маладому чалавеку" каментар на тэму ўплыву сьпёкі на расьліны і ўраджай. Пазьней аграному стала вядома, што яго інтэрв'ю было ў эфіры польскага спадарожнікавага тэлеканалу "Белсат".

У заяве спадар Лебяшкоў паведаміў, што дакументамі здымачнай групы не цікавіўся і не даваў згоды на паказ яго інтэрв'ю ў эфіры "Белсату". Аграном папрасіў "правесьці праверку законнасьці дзейнасьці Т. Бублікавай і невядомага маладога чалавека ад імя тэлеканалу "Белсат".

У ходзе праверкі, якую праводзіла пракурор Алеся Рабцава, Тацьцяна Бублікава патлумачыла, што сапраўды сустракалася з Віктарам Лебяшковым, каб узяць каментар аб засушлівым надвор'і. Аднак гэта было ў рамках супрацоўніцтва з прыватнай польскай фірмай "N.E.W. S. Informacije", з якой яна мае дамову ад пачатку 2010 году. Паводле дамовы, выканаўца мае прадстаўляць відэаматэрыялы на замову польскага боку. На згаданую фірму не ўскладзены функцыі рэдакцыі СМІ.

"Я ні з якімі сродкамі масавай інфармацыі не супрацоўнічаю – ні з беларускімі, ні з замежнымі. Пасьведчаньне журналіста ў мяне адсутнічае, – адзначыла ў тлумачэньнях сябра БАЖ. – Я лічу, што заканадаўства аб сродках масавай інфармацыі ці якога-небудзь іншага не парушаю".

У выніку Тацьцяна атрымала папярэджаньне, падпісанае пракурорам вобласьці Валянцінам Шаевым. У дакуменце гаворыцца: "Як устаноўлена праверкай, Вы, ня маючы працоўных ці іншых дагаварных адносінаў са СМІ і ня маючы акрэдытацыі пры МЗС у якасьці карэспандэнта замежнага СМІ, ажыцьцяўлялі журналісцкую дзейнасьць, што зьяўляецца парушэньнем Закону "Аб сродках масавай інфармацыі".

У канцы пракурор папярэджвае, "што ў выпадку паўторнага парушэньня заканадаўства аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі Вы будзеце прыцягнутыя да больш строгай адказнасьці".

"У кабінеце пракурора я доўга не магла зразумець, у чым сутнасьць парушэньня закону "Аб СМІ", – расказала Т. Бублікава Службе маніторынгу БАЖ. – Алеся Рабцава тлумачыла мне разы тры, што журналіст мусіць мець дамову са СМІ ці акрэдытацыю, а інакш, паводле закону, нельга. А тое, што мая фірма – не рэдакцыя, маўляў, ня мае значэньня. Галоўнае, што мая дзейнасьць – гэта журналістыка, але такая, якая не прадугледжана законам...

Вось і атрымліваецца, што я, працуючы фрылансерам, учыняю праваапарушэньне. Пракурор мне сказала, што, магчыма, наша заканадаўства аб СМІ не такое сучаснае, як у суседзяў і на Захадзе, але гэта яе праца, і яна мусіць кіравацца гэтым законам. Ад усьведамленьня абсурду сітуацыі я нават расплакалася. Выходзіць, заканадаўцы прымушаюць мяне ці то перастаць займацца фрылансам, ці то зьехаць туды, дзе гэта ня будзе злачынствам. Вядома, ёсьць яшчэ адно выйсьце – удасканаліць наша заканадаўства аб СМІ, увесьці ў яго паняцьце аб журналістах-фрылансерах. І мне зараз падаецца, што гэта можа стаць важным у дзейнасьці БАЖ."

З моманту ўступленьня ў сілу новага закону "Аб СМІ" (8 лютага 2009 году) органамі пракуратуры і КДБ журналістам было вынесена каля двух дзясяткаў вусных і пісьмовых папярэджаньняў за супрацоўніцтва з замежнымі СМІ.

"Я б рэкамендаваў усім журналістам, што трапляюць у такую сітуацыю, абскарджваць гэтыя папярэджаньні – аж да Камітэту па правах чалавека ААН, – раіць намесьнік старшыні ГА "БАЖ" Андрэй Бастунец. – Прадстаўнікі беларускіх уладаў працягваюць дэманстраваць абмежавальны падыход да журналісцкай дзейнасьці і свабоды выказваньня наогул. Ён супярэчыць ня толькі цывілізаваным нормам, але і міжнародным абавязкам Беларусі. Ратыфікаваўшы Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, наша дзяржава гарантавала свабоду "шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць усякага роду інфармацыю і ідэі, незалежна ад дзяржаўных межаў, вусна, пісьмова альбо сродкамі друку… альбо іншымі спосабамі на свой выбар". Падкрэсьліваю: незалежна ад дзяржаўнай мяжы і любымі сродкамі на свой выбар, а не на выбар пракурора ці іншага службоўца.


Тацьцяна БУБЛІКАВА.

Заўважу, што нормы аб гэтым утрымліваюцца і ў законе "Аб аўтарскім праве і сумежных правах", і "Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь".

Што тычыцца непасрэдна журналісцкай дзейнасьці, то заўважу, што ў законе "Аб СМІ" паняцьця "журналіст"… няма. У ім утрымліваецца толькі вызначэньне "журналіст сродку масавай інфармацыі", якое, натуральна, не ахоплівае ўсёй журналісцкай супольнасьці, асабліва з улікам хуткасьці разьвіцьця Інтэрнэту.

У той жа час, гэтае вызначэньне не забараняе журналісцкай дзейнасьці без "прывязкі" да канкрэтнага СМІ, у рэжыме "фры-ланс" – калі журналіст рыхтуе матэрыялы "на сваю рызыку" і прапаноўвае іх розным выданьням, тэлерадыёкампаніям ці прадзюсэрскім фірмам. На жаль, прадстаўнікі дзяржаўных органаў спрабуюць пакінуць фрылансераў па-за законам. Але ж гэта, паўтаруся, разыходзіцца ня толькі з еўрапейскай практыкай і міжнароднымі абавязальніцтвамі нашай краіны, але і з уласным унутраным заканадаўствам. Якое, дарэчы, мусіць падпарадкоўвацца гэтым міжнародным абавязальніцтвам".

**Паводле прэс-службы "БАЖ".**

## Падатковая цісьне на "Бобруйский курьер"

**Галоўнага рэдактара недзяржаўнай газеты "Бобруйский курьер" Анатоля Санценку 13 жніўня выклікалі ў мясцовую падатковую інспекцыю, дзе катэгарычна запатрабавалі ўнесьці зьмяненьні ў штатны расклад і павысіць аклады супрацоўнікам. Падаткавікі патлумачылі, што зрабіць гэта неабходна ў адпаведнасьці з рашэньнем Бабруйскага гарвыканкаму. Кіраўнік выданьня папрасіў прадаставіць яму пісьмовае прадпісаньне на гэты конт. Замест гэтага А. Санаценку прыгразілі перадаць дадзеныя на "Бобруйский курьер" у Камітэт дзяржаўнага кантролю.**

**Галоўны рэдактар лічыць, што цяпер адбываецца передвыбарная "лакіроўка рэчаіснасьці". То бок – хочаш ня хочаш, а павышай заробак супрацоўнікам да вызначанага дзяржавай узроўню. "Гэта і ёсьць класічная праява яшчэ сталінскабрэжнеўскай адміністрацыйна-каманднай сістэмы", – мяркуе А. Санаценка.**

**Нагадаем, што "Бобруйский курьер" – адно з найстарэйшых выданьняў рэгіёну (быў заснаваны ў 1914 г., закрыты ў 1920, аднавіў выхад у 1990 г.). У лютым 2007 году прадпрыемствы "Саюздруку" ў аднабаковым парадку скасавалі дамоўленасьці з выданьнем. У ліпені 2009 г."Бобруйский курьер" вярнулі ў кіёскі.**

# Абсурднае і бяздоказнае абвінавачаньне...

## Заява ГА "БАЖ" з нагоды адкрытага ліста старшыні БКДП А. Ярашука

Днямі быў распаўсюджаны адкрыты ліст старшыні Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў Аляксандра Ярашука – беспрэцэдэнтна зьняважлівы ў дачыненьні да незалежных сродкаў масавай інфармацыі.

Гэтым крокам сп. Ярашук засьведчыў, што яго стаўленьне да СМІ практычна супадае з падыходамі цяперашняй улады. Старшыня БКДП катэгарычна не прымае ніякіх пунктаў гледжаньня, акрамя ўласнага, і нервова рэагуе нават на самую далікатную крытыку.

Яшчэ 4 студзеня 2010 г. Аляксандр Ярашук сьцьвярджаў: "СМИ – последняя крепость, которую, если сдать, то нет никакого смысла вообще рассуждать о президентских выборах или о выборах в местные органы власти... То, что сейчас происходит в отношении к "Народной Воле" к Интернету – это очень ярко показывает угрозу, которая существует для демократического сообщества нашей страны". А ўжо 27 ліпеня старшыня БКДП заявіў, што "гады чатыры" як расчараваўся ў незалежных выданьнях, і заклікаў усіх не чытаць беларускія незалежныя газеты, бо, маўляў, ім "заплаціў хтосьці, каб "замачылі" Ярашука", які нібыта зьяўляецца "магчымым патэнцыйным кандыдатам у прэзідэнты".

Гэтае чарговае абсурднае і бяздоказнае абвінавачаньне з вуснаў Аляксандра Ярашука пацьвярджае, што галоўныя рэдактары незалежных СМІ мелі рацыю, калі прымалі заяву з нагоды ціску асобных прафсаюзных функцыянераў на сайт "Салідарнасьць".

Раней аб'ектам для нападак старшыні БКДП было асобнае інтэрнэт-выданьне, цяпер – уся незалежная прэса. Пры гэтым ажыцьцяўляецца падмена паняцьцяў: крытыку на свой адрас Аляксандр Ярашук спрабуе выдаць за "арганізацыю раскола ў БКДП".

Прымаючы да ўвагі вышэйзгаданае, Грамадскае аб'яднаньне "Беларуская асацыяцыя журналістаў" заяўляе:

– ГА "БАЖ" выказвае падтрымку пазіцыі калектыву інтэрнэт-газеты "Салідарнасьць" і рэдактараў вядучых незалежных выданьняў Беларусі ў дачыненьні да дзеяньняў і заяваў Аляксандра Ярашука;

– Абсурдныя заявы кіраўніка БКДП ніякім чынам не ўплываюць на прыхільнае стаўленьне незалежнай журналісцкай супольнасьці Беларусі да сябраў дэмакратычных прафесійных саюзаў – іх грамадзянская пазіцыя і сьмеласьць у адстойваньні дэмакратычных прынцыпаў і правоў грамадзянаў нашай краіны заслугоўвае павагі;

– ГА "БАЖ" заўсёды прынцыпова адстойвала і будзе адстойваць надалей правы журналістаў і свабоду выказваньня ў Беларусі, незалежна ад таго, хто намагаецца гэтыя правы і свабоды парушыць.

*Зацьверджана*
*Праўленьнем ГА "БАЖ"*
*3 жніўня 2010 г.*

# Ціск узмацняецца напярэдадні выбараў

"Рэпарцёры бяз межаў" шкадуюць, што ціск на беларускую прэсу з набліжэньнем прэзідэнцкіх выбараў узмацняецца. Пра гэта гаворыцца ў адмысловай заяве, якую арганізацыя распаўсюдзіла 17 жніўня. Гаворка ідзе найперш пра папярэджаньні, падатковыя праверкі і міліцэйскія рэйды, якія, на думку "Рэпарцёраў", сьведчаць пра тое, што свабода прэсы ў Беларусі апынулася ў небясьпецы.

"Пасьля атрыманьня шэрагу папярэджаньняў ад Міністэрства інфармацыі дзьве вядучыя апазіцыйныя газеты – "Народная воля" і "Наша Ніва" – могуць быць закрытыя паводле арт. 51 закону "Аб СМІ", які дазваляе ўладам ініцыяваць закрыцьцё нават пасьля двух папярэджаньняў", – падкрэсьліваюць "Рэпарцёры" і нагадваюць, што на рахунку абедзьвюх газетаў ужо налічваецца па тры такіх санкцыі.

Арганізацыя цытуе галоўнага рэдактара "НН" Андрэя Скурко, які расцэньвае гэтыя папярэджаньні, як і пазапланавую падатковую праверку рэдакцыі, як спробу запалохаць журналістаў.

"Рэпарцёры бяз межаў" перасьцерагаюць, што ўсе тыя трывожныя сігналы, што цяпер паступаюць на адрас выданьняў, пракладаюць шлях для новых урадавых забаронаў напярэдадні кампаніі па выбарах прэзідэнта".

"Рэпарцёры" прыгадваюць таксама міліцэйскія "візіты" ў рэдакцыю "Народнай волі" сёлета зімой і вясной, калі ў журналістаў выданьня забралі кампутары, а пасьля шмат разоў дапытвалі ў межах расьследаваньня справы аб паклёпе на чыноўніка сьпецслужбаў.

"Пасьля трохгадовага выключэньня з беларускіх сістэмаў распаўсюду, якія цалкам кантралююцца дзяржавай, "Народная воля" і "Наша Ніва" зноў пачалі распаўсюджваць з 2008 году ў выніку дамоўленасьцяў паміж Беларусьсю і Еўрасаюзам. "Рэпарцёры" апасаюцца, што ўсе тыя трывожныя сігналы, што цяпер паступаюць на адрас выданьняў, пракладаюць шлях для новых урадавых забаронаў напярэдадні кампаніі па выбарах прэзідэнта", – гаворыцца ў заяве.

Арганізацыя занепакоеная і іншымі праблемамі, з якімі даводзіцца сутыкацца беларускім журналістам – гэта і забарона на супрацоўніцтва з замежнымі СМІ без акрэдытацыі, і фактычнае прызнаньне незаконнай дзейнасьці фрылансераў. ("Рэпарцёры" прыгадваюць тут нядаўняе папярэджаньне гомельскай журналісткі Тацьцяне Бублікавай).

Трывогу "Рэпарцёраў бяз межаў" выклікае і ціск на журналістаў з боку міліцыі – напрыклад, стварэньне перашкодаў у працы карэспандэнтаў "Еўрарадыё", "Нашай Нівы", Радыё "Свабода", якія асьвятлялі вулічную акцыю актывістаў кампаніі "Гавары праўду!" 12 жніўня.

## ...Узяў на сябе ролю "цэнзара"

**Кіраўнік УП "Брэстаблсаюздрук" Васіль Марэйка ў аднабаковым парадку на дзьве трацiны зьнізіў замову тыражоў газеты "Брэсцкі кур'ер". Пра гэта паведаміў у сваім артыкуле на сайце БАЖ галоўны рэдактар "Брэсцкага кур'ера" Мікалай Аляксандраў.**

**Паводле словаў рэдактара выданьня, кіраўнік УП "Брэстаблсаюздрук" вырашыў такім чынам "пакараць" калектыў газеты за самавольства ў пошуку іншых шляхоў распаўсюду выданьня.**

**"У вырашэньні пытаньняў рэалізацыі і знаходжаньня альтэрнатываў мы ні ў якім выпадку ня мелі намеру выходзіць з партнёрскіх стасункаў з "Брэстаблсаюздрукам". Нашыя дамоўныя стасункі з іншымі гандлёвымі сеткамі Берасьця абумоўленыя тым, што праз іх газета прыходзіць да чытачоў у той жа дзень, калі друкуецца ў друкарні. А "Брэстаблсаюздрук" дастаўляе нашыя тыражы ў свае гандлёвыя кропкі звычайна толькі на наступны дзень", – адзначае Аляксандраў.**

**У гэтым жа выпадку, лічыць рэдактар "Брэсцкага кур'ера", атрымалася, што Марэйка выступіў свайго роду "цэнзарам", абмежаваўшы доступ да інфармацыі для немалой часткі чытачоў. Спробы вырашыць гэтае пытаньне шляхам перамоваў не сталіся пасьпяховымі.**

# Усходнія дыктатуры вучацца ў Беларусі

Улады Егіпта напярэдадні чарговых прэзідэнцкіх выбараў улічылі багаты досьвед Беларусі па стрымліваньні грамадзкай актыўнасьці. Сярод так званых "антырэвалюцыйных мераў" запланаванае ўвядзеньне крымінальнай адказнасьці за "дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі". У сувязі з гэтым Асамблея няўрадавых дэмакратычных арганізацыяў накіравала ў Амбасаду Егіпта Заяву пра салідарнасьць з прадстаўнікамі тамтэйшай грамадзянскай супольнасьці.

Падуладныя аўтарытарнаму лідэру Егіпта Хосьні Мубараку СМІ апублікавалі чарнавы варыянт законапраекту па НДА, з увядзеньнем якога паўстануць шматлікія забароны і перашкоды ў дзейнасьці грамадзкіх аб'яднаньняў. У прыватнасьці, плануецца забараніць працу грамадзкіх аб'яднаньняў больш чым у двух накірунках дзейнасьці і без ліцэнзіі Міністэрства сацыяльнай салідарнасьці. Другое "ноў-хаў" па сваім зьмесьце нагадвае адыёзны артыкул крымінальнага кодэксу РБ № 193.1. Акрамя таго, для атрыманьня бязвыплатнай дапамогі неабходны дазвол дзяржаўных органаў, а ўсе паўнамоцтвы па рэгуляваньні дзейнасьці НДА пераходзяць да праўладнай Агульнай Федэрацыі Грамадзкіх Асацыяцыяў. І ў дадатак да ўсяго, забараняецца дзейнасьць НДА, якая "парушае этыку", хоць юрыдычнае вызначэньне такіх парушэньняў адсутнічае.

Дэмакратычная грамадзкасьць Егіпта, занепакоеная магчымым перасьледам сяброў грамадзкіх аб'яднаньняў, распачынае кампанію па змаганьні за свабоду асацыяцыяў. У межах кампаніі прадстаўнікі 71 егіпецкіх арганізацыяў падпісалі дэкларацыю, у якой выказалі пратэст адносна новага варыянту законапраекту па НДА.

Пратэст егіпецкіх арганізацыяў падтрымала Асамблея няўрадавых дэмакратычных арганізацыяў. 24 жніўня беларуская асацыяцыя скіравала да Амбасады Егіпта Заяву салідарнасьці.

"Асамблея НДА Беларусі выказвае занепакоенасьць у сувязі з наступам на свабоду асацыяцыяў у Егіпце. (...) Надзвычай засмучаюць захады егіпецкіх уладаў, скіраваныя на крымінальны перасьлед дзейнасьці незарэгістраваных грамадзкіх арганізацыяў. Менавіта супраць такой формы рэпрэсіяў у дачыненьні да грамадзянскай супольнасьці актыўна змагаюцца лідэры і актывісты сотняў арганізацыяў у самой Беларусі...", – адзначаецца ў тэксьце заявы.

Як падкрэсьліла каардынатарка кампаніі "Стоп 193.1!" Алёна Валынец, падтрымка егіпецкіх арганізацыяў беларускай Асамблеяй няўрадавых дэмакратычных аб'яднаньняў зусім не выпадковая. "Мы самі, як прадстаўнікі грамадзянскае супольнасьці, у межах кампаніі "Стоп 193.1!" змагаемся за свабоду асацыяцыяў і супраць крыміналізацыі заканадаўства ў дачыненьні да беларускіх НДА. Замежныя калегі з геаграфічна аддаленых краінаў шматразова выказвалі салідарнасьць з беларускімі актывістамі. І мы самі, разумеючы важнасьць салідарнасьці і ўзаемападтрымкі, будзем рэагаваць на выпадкі перасьледу і дыскрымінацыі аб'яднаньняў, што церпяць ад рэпрэсіўных рэжымаў", – заявіла Алёна Валынец.

Нагадаем, кампанія "Стоп 193.1", ініцыяваная Асамблеяй НДА, стартавала ў чэрвені 2009 году. Мэта кампаніі – скасаваньне артыкулу 193.1 Крымінальнага кодэксу. На дадзены момант да ініцыятывы далучыліся дзясяткі беларускіх і замежных арганізацыяў. Сярод мерапрыемстваў у межах кампаніі – гэпэнінгі і флэш-мобы, тэматычныя круглыя сталы і заявы да дзяржаўных інстытуцыяў, звароты грамадзянаў і замежных арганізацыяў да беларускіх парламентароў.

Даведка: Улада ў Егіпце з 1954 году сканцэнтраваная ў руках прадстаўнікоў дынастыі "ваенных фараонаў" (Насэр, Садат, Мубарак). У апошнія месяцы ў Егіпце актывізаваліся грамадзкія рухі і апазіцыйныя арганізацыі, якія выводзяць сваіх прыхільнікаў на шматтысячныя акцыі пратэсту супраць 83-гадовага Хосьні Мубарака. Аўтарытарны лідэр кіруе Егіптам ужо 30 гадоў. У краіне забароненая дзейнасьць пазапарламенцкіх партыяў, жорстка перасьледуюцца іншадумцы. Сёлета ў траўні парламент Егіпту працягнуў на два гады дзеяньне закону аб надзвычайным становішчы, якое было ўведзенае ў краіне пасьля забойства папярэдняга прэзідэнта Анвара Садата ў 1981-м годзе.

Між іншым, крыміналізацыя грамадзкай дзейнасьці, як у Егіпце, так і ў Беларусі адбыліся напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў. Як вядома, артыкул 193.1 КК РБ быў ухвалены перад прэзідэнцкай кампаніяй 2006 году ў якасьці так званых "антырэвалюцыйных мераў".

# Артыкул 193.1 павінен быць скасаваны




Актывісты Асамблеі НДА ўзьняліся на самую высокую кропку краіны з расьцяжкай кампаніі "Стоп 193.1!" – на гару Сьвятую (афіцыйная назва – гара Дзяржынская). З гэтай сімвалічнай акцыі пачынаецца новы этап змаганьня за адмену адыёзнага артыкулу Крымінальнага кодэксу, які прадугледжвае адказнасьць за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі.

Гара Сьвятая – вышэйшая кропка ў Беларусі, якая знаходзіцца на ўзроўні 345 метраў над узроўнем мора. Менавіта з яе вяршыні і было вырашана зьвярнуць увагу на праблему абмежаваньня свабоды асацыяцыяў. Удзельнікі акцыі спадзяюцца, што, можа быць, хоць з найвышэйшага пункту Менскага ўзвышша атрымаецца нагадаць уладам пра шматлікія абяцаньні адносна скасаваньня артыкулу 193.1 КК РБ.

"Улады неаднаразова казалі пра адмену крымінальнай адказнасьці за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі і на міжнародных форумах, і падчас сустрэчаў з высокапастаўленымі еўрачыноўнікамі, – адзначае каардынатар кампаніі Алёна Валынец. – Аднак да рэальных крокаў у напрамку скасаваньня артыкулу 193.1, на жаль, так і не дайшло. Дарэчы, 20 жніўня споўніўся роўна адзін год з моманту першага абяцаньня. Намесьнік міністра юстыцыі Ігар Тушынскі ў сваім адказе чэскаму аб'яднаньню "Грамадзянская Беларусь" напісаў, што мяркуецца выключэньне нормы пра крымінальную адказнасьць актывістаў незарэгістраваных аб'яднаньняў. Год прайшоў, а нічога не зьмянілася. З вяршыні гары хочам нагадаць чыноўнікам, што свае абяцаньні трэба выконваць".

Актывісты Асамблеі НДА запэўнілі, што кампанія "Стоп 193.1!" будзе працягвацца да моманту скасаваньня ганебнага артыкулу.

# "Гавары праўду" не падабаецца ўладам...

З дапамогай службы ўскрыцьця замкоў магілёўскія актывісты "Гавары праўду" здолелі 16 жніўня патрапіць у сваю сядзібу. Невядомыя зламысьнікі пашкодзілі дзьвярныя замкі. Выкліканыя на месца здарэньня міліцыянты склалі пратакол аб правапарушэньні.

Адзін з магілёўскіх лідэраў руху "Гавары праўду" Ігар Каваленка лічыць, што маёмасьць арганізацыі пашкодзілі супрацоўнікі сілавых структураў. Пра гэта ён заявіў і міліцыянту.

Ігар Каваленка: "Гэта ўсё справа рук КДБ. Іх правакацыя. Яны абралі шлях дробнага свавольства. Гарэзяць яны такім чынам не ўпершыню. Першы раз у замочнае вочка натыкалі скрэпак. Адбылося гэта адразу пасьля травеньскага ператрусу, калі ў нас забралі аргтэхніку і друкаваныя матэрыялы. Цяпер жа заляпілі яго будаўнічай сумесьсю, якая так закалянела, што аддзерці яе не было ніякай магчымасьці. Служба ўскрыцьця замкоў выламала дзьверы. Цяпер мы мяняем два замкі. У мінулую пятніцу, калі мы ехалі на карпаратыўную сустрэчу, тры машыны нашых актывістаў затрымалі супрацоўнікі дзяржаўтаінсьпекцыі. Потым у іх быў праведзены міліцыянтамі ператрус. Нічога не знайшлі. Як нам паведамілі нашы суседзі – у пятніцу двое хлопцаў у цывільным выпытвалі, куды мы паехалі, хто мы такія і што зьбіраемся рабіць. І сёньняшні выпадак, і ператрус машын у пятніцу – гэта спробы сьпецслужбаў запалохаць нашых актывістаў".

У Гародні працягваецца перасьлед аднаго з мясцовых лідэраў АГП Дзьмітрыя Бандарчука, актывіста кампаніі "Гавары праўду". За апошнія паўгады ён пераніжыў некалькі ператрусаў і затрыманьняў, адміністрацыйных судоў. А 9 жніўня ў машыне Дзьмітрыя Бандарчука былі прабітыя два колы. Здарылася гэта акурат напярэдадні выезду ў Зэльву, дзе адзначаліся сотыя ўгодкі з дня нараджэньня Ларысы Геніюш. Машына Бандарчука стаяла нават не пад яго домам, а ў суседнім двары, дзе была належна прыпаркаваная. Але невядомымі яна была "вылічана" беспамылкова і пашкоджана відавочна невыпадкова.

Трэба сказаць, што гарадзенскія работнікі "нябачнага фронту" досыць часта апускаюцца да метадаў псаваньня аўтамабіляў мясцовых грамадзка-палітычных актывістаў. Можна прыгадаць, што напярэдадні буйных сталічных і рэгіянальных акцыяў у розны час былі пашкоджаныя аўтамабілі Віктара Сазонава, Сяргея Мальчыка, Сяргея Антусевіча, Аляксандра Мілінкевіча, Алега Калінкова. Ня так даўно фарбай была аблітая і машына менскіх актывістаў кампаніі "Гавары праўду", якія ў Гародні зьбіралі подпісы за наданьне вуліцы імя Васіля Быкава.

Дзьмітры Бандарчук расцэньвае чарговы выпадак як праяву на яго псіхалагічнага ціску з боку ўладных структураў. Па факце наўмыснага прабіваньня колаў актывіст напісаў адпаведную заяву ў міліцыю. Сумнеўна, аднак, што ахоўнікі правапарадку знойдуць шкоднікаў.

11 жніўня актывіста "Гавары праўду" Сяргея Лапуціна пратрымалі ў Кастрычніцкім аддзеле міліцыі Магілёву больш за тры гадзіны. На яго складзеныя пратаколы адміністрацыйнага правапарушэньня і канфіскацыі друкаванай прадукцыі. Яны будуць накіраваныя ў суд.

"Мяне спынілі супрацоўнікі дзяржаўтаінсьпекцыі перахопам, каб праверыць дакументы. Я ехаў у бок прадпрыемства "Хімвалакно". Убачылі пару газетаў. Аднак іх цікавілі, як я потым зразумеў, не газеты. Яны меркавалі, што я еxаў аддаваць сабраныя раней подпісы дэпутату аблсавету, кіраўніку "Хімвалакна" Пузевічу за неадкладнае вырашэньне розных сацыяльных праблемаў. Акурат у гэты дзень мы іх зьбіраліся аддаваць. Яны ў мяне дапытваліся, ці ёсьць падпісныя лісты альбо звароты да дэпутатаў. Ну, а газеты далі падставу для затрыманьня. Цяпер на мяне склалі пратакол за распаўсюджваньне сродкаў масавай інфармацыі. Будуць выклікаць у суд. Канфіскавалі некалькі соцень асобнікаў газеты "Электрычка". Буду чакаць позвы ў суд. Ён павінен пастанавіць, што са мной рабіць", паведаміў адразу пасьля вызваленьня Сяргей Лапуцін.

Актывіста затрымалі каля адзінаццатай гадзіны дня. Міліцыянты амаль гадзіну адмаўляліся тлумачыць, чым выкліканае затрыманьне. Потым правялі агляд машыны. Там выявілі газеты.

Пакуль Лапуцін быў пад вартай, каля будынка Кастрычніцкага аддзелу міліцыі знаходзіліся актывісты "Гавары праўду". Яны дамагліся, каб панятым падчас ператрусу машыны быў актывіст Свабоднага прафсаюзу Беларускага Сяргей Фамін.

# Справа Тэрэзы Собаль. Працяг будзе...

Супраць актывісткі Саюзу палякаў (не прызнаванага ўладамі) Тэрэзы Собаль з Івянца Валожынскага раёну чарговым разам адноўленая крымінальная справа аб нібыта злоўжываньні ёю службовым становішчам.

Як паведаміў адвакат Аляксандр Галіеў, сьледчы Валожынскага РАУС 5 жніўня даведаўся, што яму вяртаюць справу спадарыні Собаль. Самой актывістцы стала вядома пра гэта толькі таму, што ў гэты дзень яе ня выпусьцілі ў Польшчу на КПП у Берасьці. Пра гэта паведаміў старшыня Галоўнай рады Саюзу палякаў Андрэй Пачобут.

Аляксандр Галіеў пакуль ня ведае, на якой падставе адменена пастанова аб узбуджэньні крымінальнай справы супраць Тэрэзы Собаль і чаму справа зноў адноўлена. Ён нагадвае, што справу ўжо спынялі двойчы: спачатку – з-за скančэньня тэрміну даўнасьці, пазьней – з-за адсутнасьці складу злачынства.

"Аднаўленьне ў 3-ці раз крымінальнай справы ў дачыненьні да былой дырэктаркі Дому польскага ў Івянцы Тэрэзы Собаль было для нас нечаканасьцю. Справа Тэрэзы Собаль непасрэдна зьвязана з працягам змаганьня афіцыйнага Менску за польскі Дом ў Івянцы" – пракаментаваў першы сакратар польскага пасольства ў Менску Павел Марчук затрыманьне на мяжы ў Берасьці актывісткі непрызнанага ўладамі Беларусі Саюзу палякаў.

"Мы вельмі зьдзіўленыя. Мы думалі, што гэтая справа, у сувязі з характарам і адсутнасьцю доказаў, будзе закрыта. Вырашылі інакш. Цяжка нават прадказаць далейшае разьвіцьцё падзеяў. Мы прымем больш шырокія дзеяньні, нацэленыя пакласьці канец непатрэбнаму абодвум бакам канфлікту", – заявіў Павел Марчук.

Павел Марчук таксама паведаміў, што польскі бок прадпрымае дыпламатычныя захады па высьвятленьні сітуацыі вакол справы Тэрэзы Собаль.




Тэрэза СОБАЛЬ.

Нагадаем: крымінальная справа супраць Собаль была распачатая 5 студзеня сёлета. Актывістку падазравалі ў злоўжываньні службовым становішчам, а канкрэтна яе вінавацілі ў тым, што яна, будучы дырэктаркай Дому польскага ў Івянцы, атрымала ад кіраўніцтва СПБ па выніках працы за 2004 год грашовую дапамогу.

# У кляштары будзе гатэль?

Комплекс будынкаў былога кляштару бернардынаў у Менску вернікам перададзены ня будзе. Пра гэта 4 жніўня на прэс-канферэнцыі ў Менску заявіў Міхаіл Жых, галоўны інжынер КУП "Мінская спадчына", якое займаецца рэканструкцыяй і рэстаўрацыяй гэтага комплексу.

"Натуральна, кляштару там ня будзе, – сказаў М. Жых. – Там будуць гатэльныя нумары, паколькі функцыянальнае прызначэньне найбольш набліжанае да кляштарных кельляў. На жаль, гэта будуць не камфортныя пяцізоркавыя нумары, але ў нас атрымаецца ўзнавіць стыль і стварыць гатэльныя нумары з максімумам выгодаў для сучаснага спажыўца".

Паводле словаў галоўнага інжынера, гатэльны комплекс у былым кляштары бернардынаў плануецца здаць у эксплуатацыю ўжо ў 2013 годзе. "Гэты комплекс увайшоў у праграму стварэньня гатэльнага сэрвісу да правядзеньня ў Менску Чэмпіянату сьвету па хакеі ў 2014 годзе. Таму мы хочам узьвесьці асноўныя збудаваньні ўжо ў 2013 годзе, каб у 2014 годзе пачаць яго непасрэдна эксплуатаваць", – паведаміў М. Жых.

Ён адзначыў, што на тэрыторыі комплексу разьмесьціцца таксама некалькі музеяў. У прыватнасьці, у некаторых памяшканьнях гатэльнага тыпу можа разьмесьціцца музей кляштарнага побыту, у гаспадарчых памяшканьнях – музеі карэтаў і пажарнай справы. "У межах археалагічных раскопак там выяўленыя рэчы, якія датаваныя XII стагодзьдзем: манеты, наканечнікі, некаторыя іншыя фрагменты. Яны дазволяць нам стварыць там маленькі музей археалогіі", – сказаў М. Жых.

Нагадаем: з сакавіка 2005 году сябры менскай рымска-каталіцкай супольнасьці сьвятога Іосіфа праводзяць рэгулярныя вечаровыя малітвы за вяртаньне вернікам будынкаў Менскага кляштару бернардынаў з касьцёлам – помніка архітэктуры барока XVII стагодзьдзя. Будынак сьвятыні, збудаванай у свой час на сродкі вернікаў, быў канфіскаваны ў 1864 годзе ўладамі Расейскай імперыі за ўдзел вернікаў у нацыянальна-вызваленчым паўстаньні супраць расейскага царызму пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага.

Рэгулярныя малітвы пачаліся пасьля таго, як стала вядома пра планы Менгарвыканкаму перадаць будынкі інвестарам для прыстасаваньня пад гатэльны комплекс і аб'екты гандлёва-побытавага прызначэньня.

Тым часам, старшыня Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон Астаповіч неаднаразова заяўляў, што прыстасаваньне кляштару пад гатэль прывядзе да страты шмат якіх адметных рысаў помніка архітэктуры.

## БХД пачала масавую кампанію ў абарону Касьцёла святога Язэпа

**18 жніўня на паседжаньні групы, створанай Беларускай Хрысьціянскай Дэмакратыяй для абароны Касьцёла сьвятога Язэпа, быў дадзены старт масавай кампаніі абароны сьвятыні.**

**На першым этапе (цягам бліжэйшых двух тыдняў) актывісты БХД у 14 гарадах Беларусі зьбяруць некалькі тысячаў подпісаў з патрабаваньнем вярнуць Касьцёл вернікам. У бліжэйшыя выходныя збор подпісаў пройдзе таксама ў каталіцкіх пілігрымках ды каля менскіх касьцёлаў.**

**На пачатку верасьня сабраныя подпісы плануецца перадаць у адміністрацыю Аляксандра Лукашэнкі, КУП "Мінская спадчына", якое займаецца "рэканструкцыяй" комплексу, у дзяржаўныя ўстановы, Ватыкан ды ў замежныя амбасады.**

**Калі рэакцыі на зварот ня будзе, БХД плануе распачаць штодзённае пікетаваньне каля будынку Касьцёла і кляштара, а таксама разгортваньне шырокай кампаніі салідарнасьці ў Facebook і Кантакце. БХД зьбіраецца зрабіць гэтую кампанію міжканфесійнай і шматтысячнай.**

**"Сёньняшняя дзяржаўная сістэма пабудаваная такім чынам, што падчас "передвыбарчай кампаніі" найбольш верагодна дасягнуць канкрэтнага выніку ў пытаньні вяртаньня Касьцёла вернікам", – адзначыў лідэр БХД Павел Севярынец.**

**Нагадаем, згодна з планамі Менгарвыканкаму, будынак мусіць быць прыстасаваны пад гасьцінічны комплекс і аб'екты гандлёва-побытавага прызначэньня.**

**У 2007 годзе кіраўніку Беларусі быў накіраваны зварот з больш чым 30 тысячамі подпісаў за вяртаньне Касьцёла вернікам, аднак з пачатку 2010 году вядуцца працы па пераабсталяваньні касьцёла ў гатэль.**

# "Ідзіце і працуйце на апазіцыю!"

Ярослава Грышчэню ў чарговы раз звольнілі з працы за грамадзка-палітычную дзейнасьць. Напрыканцы траўня Ярославу Грышчэню прапанавалі перайсьці на працу маркетолагам у турыстычную кампанію "Тэхнастар", паабяцаўшы добры заробак і цікавую працу. Ён пагадзіўся. І сапраўды, у першы месяц аніякіх праблемаў не ўзьнікала. Нечакана, адна з кіраўнічак фірмы Ала паведаміла яму, што ў пасадзе маркетолага фірма болей ня мае патрэбы і каб Ярослаў звальняўся. Ён не пагадзіўся з такой прапановай. Аднак праз некаторы час Грышчэню ізноў выклікалі да кіраўніцтва і запыталіся аб тым, ці сапраўды ён зьяўляецца адным з арганізатараў выставы сатырычных партрэтаў Лукашэнкі, якая дэманструецца на Управе БНФ, паказаўшы пры гэтым раздрукоўкі з некаторых сайтаў. Ярослаў ня стаў адмаўляць свайго ўдзелу.

5 жніўня Грышчэню прапанавалі выбар: "альбо ты сам звальняешся, альбо будзеш звольнены за парушэньне працоўнай дысцыпліны". Паколькі напачатку працы ў "Тэхнастары" яму быў абяцаны вольны графік, то ўзьнікла рэзоннае пытаньне: якія могуць быць у такім разе спазьненьні? Аднак усё тая ж Ала даверліва паведаміла страптываму маркетолагу, што "стварыць праблемы – не праблема". І абяцаньне сваё яна стрымала. Грышчэню звольнілі паўмесяцам раней, загадам ад 16 ліпеня, заплаціўшы толькі 30% абяцанага заробку, паведаміўшы, што нібыта яго бралі на працу на палову стаўкі. Пры гэтым яму прад'явілі папярэджаньне, вынесенае за парушэньне працоўнай дысцыпліны, якое, паводле ягоных словаў, яму ніколі не абвяшчалася. На разьвітаньне актывісту прапанавалі пайсьці працаваць у апазіцыю.

У сітуацыі, калі паміж працадаўцам і Ярославам Грышчэнем ня быў нават падпісаны працоўны кантракт, свае правы адстойваць досыць праблематычна, аднак Ярослаў мае намер зьвярнуцца са скаргаю ў суд, каб той даў прававую ацэнку дзеяньням кіраўніцтва СП "Тэхнастар", паколькі ў сваім звальненьні бачыць толькі палітычны падтэкст.

Нагадаем, што гэта не першы факт звальненьня актывіста-маладафронтаўца з працы: у 2007 годзе яго звольнілі з пасады гукарэжысёра Палаца культуры чыгуначнікаў у Баранавічах і таксама за грамадска-палітычную дзейнасьць.

"Права на волю". Праваабарончы бюлетэнь. Выходзіць два разы на месяц на беларускай і рускай мовах.
Наклад 299 асобнікаў. Пры передруку спасылка на бюлетэнь абавязковая.